ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту— іншагароднія абвесткі—1 р. за
Пасярод тэксту—у два разы да
Пры шматразовым друкаванні ка. Чвыш тарыфу, згодна пастано СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Москва, Б-ка ВСНХ СССР
Объя. студ. сьпіс

Усіх краін, злучайцеся! Пралетары

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 5 верасьня 1930 г.
№ 207 (3045)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Совецкая, 63.

Усе сілы партыі, усе сілы рабочае клясы

на выкананьне прамфінпляну, на забесьпячэньне праграмы трэцяга году пяцігодкі

Да ўсіх партыйных, гаспадарчых, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый

Праз месяц пачынаецца новы гаспадарчы год — трэці год пяцігодкі. Гэты надыходзячы год высоўвае рад вельмі складаных і адказных гаспадарчых і палітычных задач. Ён мае рашаючае значэньне для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і павінен забясьпечыць пераход ня менш чым паловы сялянскіх гаспадарак на сацыялістычны шлях, на шлях калектывізацыі.

Трэці год пяцігодкі азначае новы гігантскі крок у справе індустрыялізацыі СССР. Адзін толькі прырост прадукцыі за 1930-31 г. будзе раўнацца ўсёй даваеннай прамысловай вытворчасьці. У трэцім годзе пяцігодкі, побач з законганьмі і ўступаючымі ўжо ў эксплёатацыю Сталінградзкім трактарным заводам, Растоўскім заводам сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва і іншымі новымі заводамі, трэба забясьпечыць разгортваньне на поўны ход будаўніцтва такіх гігантаў, як Магнітабуд, на пабудову якога павінна быць выдаткавана за 1 год больш 200 млн. рублёў, Кузьнецкбуд, Ніжагародзкі аўтазавод, Харкаўскі і Чалябінскі трактарныя, Уральскі гігант цяжкага машынабудаўніцтва, першая чарга буйнейшых хімічных камбінатаў Беразьнікоўскага і Бобрыкаўскага, Саратаўскі камбайны і г. д. Пераважная большасьць гэтых заводаў, якія па сваёй магутнасьці перавышаюць усё, што краіна мела да гэтага часу ў галіне мэталюргіі, хэміі і машынабудаўніцтва, павінны быць пушчаны ў ход на працягу трэцяга году пяцігодкі, адны поўнасьцю, другія ў першую чаргу.

Апрача таго, у будучым годзе пачынаецца будаўніцтва такіх новых заводаў, як Ніжнятагільскі і Марыўпальскі мэталюргічны і Дніпракамбінат у складзе цэлага раду буйнейшых новых заводаў. У 1930-31 г. мы павінны дабіцца першых буйных рэзультатаў у ажыцьцяўленьні дырэктывы XVI зьезду ад стварэньні новай вугальнай мэталюргічнай базы ў СССР — Урала-Кузьнецкага камбінату.

Праграму будучага году вызначаюць наступныя рашаючыя лічбы: 7,5 млн. тон чыгуну, 74,5 млн. тон вугаля, на 2,5 млрд. руб. новых машын, апрача таго на 845 млн. рублёў сельска-гаспадарчых машын і 745 тыс. конскіх сіл новых трактараў.

Посьпехі ў разьвіцьці цяжкай індустрыі і рост сельска-гаспадарчай сыравой базы (пашырэньне пасеўных плошчаў, павышаны ўраджай бавоўны, бураку і раду іншых тэхнічных культур) забясьпечваюць значна больш высокі, чым у мінулыя гады тэмп росту лёгкай прамысловасьці. Побач з правядзеньнем іншых мер, гэта стварае прадпасылкі для паляпшэньня забесьпячэньня прадметамі шырокага спажываньня і для вымяхчэньня таварнага голаду.

Ажыцьцяўленьне гэтай вытворчай праграмы патрабуе рашучага паляпшэньня якасьці ўсёй гаспадарчай работы. Усе якасныя паказьнікі работы прамысловасьці і ў першую чаргу паказьнікі сабекошту і прадукцыйнасьці працы павінны быць значна павышаны, і ў працягу году павінны выканацца з бязумоўнай дакладнасьцю. Бяз гэтага ня могуць быць забясьпечаны тое разгортваньне вытворства і той вялізарны план капітальных работ, якія вызначаны для 1930-31 году.

Гэта праграма разьвіцьця прамысловасьці непарыўна зьвязана з новымі вялізарнымі заданьнямі для транспарту (чыгуначнага і воднага), прад'яўляючы да яго такія высокія запатрабаваньні, якія ня могуць быць выкананы без карэнных і хутчэйшага паляпшэньня ўсёй арганізацыі транспарту і без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе ўсёй масы чыгуначнікаў і воднікаў — рабочых і тэхнічнага пэрсаналу.

У будучым 1930-31 г. мы павінны забясьпечыць таксама бальшавіцкія тэмпы разьвіцьця сацыялістычнага, саўгаснага і калгаснага сэктара ў сельскай гаспадарцы, выкананьне вялізарных вытворчых праграм такіх арганізацый, як «Зернотрест», «Скотовод», «Свиновод» і інш., забясьпечыўшы сацыялістычнае будаўніцтва, якое разгортваецца ў вёсцы, поўным ажыцьцяўленьнем заданьняў на вытворстве сельска-гаспадарчых машын, трактароў і хэмічных угнаеньняў.

Выкананьне ўсёй гэтай гігантскай гаспадарчай праграмы магчыма толькі пры самай актыўнай і прытым неадкладнай мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы, усіх партыйных арганізацый, усіх прафсаюзаў, усяго камсамолу і ўсіх бяз выключэньня гаспадарчых органаў. Неразуменьне гэтага ёсьць забыцьцё асноўнага бальшавіцкага абавязку ў справе забесьпячэньня посьпехаў будаўніцтва сацыялізму і зьяўляецца простым злачынствам перад партыяй з боку перш за ўсё кіраўнікоў гэтых арганізацый. Прызнаньне на словах генэральнае лініі партыі і няпрыняцьце на справе самых рашучых і своячасовых мер па мабілізацыі ўсяе рабочае клясы для выкананьня гэтай гаспадарчай праграмы — наварта бальшавікоў і прадстаўляе сабой горшы від правага апартунізму на практыцы.

Толькі неадкладным разгортваньнем работы па падрыхтоўцы выкананьня вытворчае праграмы прамысловасьці будучага году можна забясьпечыць ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў разьвіцьця індустрыі, прынятых XVI зьездам партыі.

Важнейшай умовай выкананьня прамфінпляну будучага году зьяўляецца выкананьне прамфінпляну 1929-30 году. **Бальшавіцкая падрыхтоўка да выкананьня гігантскай вытворчай праграмы трэцяга году пяцігодкі заключаецца ў бязумоўным выкананьні прамфінпляну бягучага году.**

Другі год пяцігодкі — год буйнейшых дасягненьняў сацыялістычнай індустрыі. Буйная сацыялістычная прамысловасьць за 10 месяцаў павялічыла сваю валавую прадукцыю на 27 проц., паказаўшы рэкордныя тэмпы росту за ўвесь рэканструкцыйны пэрыяд. Цяжкая індустрыя, гэта аснова сацыялізму, за той-жа пэрыяд павялічыла разьмеры свайго вытворства на 39,5 проц. Аб'ём капітальнага будаўніцтва за 10 месяцаў вызначаецца ў 2,4—2,5 млрд. рублёў. Але за гэтымі посьпехамі і дасягненьнямі мы не павінны прагледзець таго сур'ёзнага прарыву, які выявіўся ў ходзе выкананьня прамысловасьцю ўстаноўленага пляну.

Прырост прамысловае прадукцыі за 10 месяцаў на 27 проц. сьведчыць аб рэзкім адставаньні ад устаноўленага плянам прыросту ў 32 проц. Ня выконваецца план ня толькі па лёгкай індустрыі, што абумоўлівалася ў бягучым годзе ў пэўнай меры недахватам сыраду, але, што асабліва важна, значна ня выконваецца таксама вытворчая праграма па цяжкай індустрыі. Яўнае паслабленьне работы прамысловасьці за апошнія месяцы стварыла простую пагрозу зрыву прынятай партыяй і савецкай уладай гадавой вытворчай праграмы. Замест бальшавіцкіх тэмпаў на радзе галін прамысловасьці назіраецца ў апошні час ганебнае зьніжэньне тэмпаў, апартуністычная стаўка на самацёк.

Яўна нездавальняючы таксама ход капітальнага будаўніцтва. План капітальнага будаўніцтва за першыя 3 кварталы выкананы менш, чым напалову. Асабліва ганебна адставаньне капітальнага будаўніцтва на «Стройобъединению», «Всехимпрому», «Коксогазохиму», «Новостали», «Машиноб'единению», «Союзсельмашу». Гэтыя недапушчальныя зьявішчы ў капітальным будаўніцтве стваракоць пагрозу прынятым тэмпам прамысловага разьвіцьця, пагрозу выкананьня пяцігодкі за 4 гады.

Важнейшай прычынай невыкананьня вытворчых заданьняў прамысловасьці і асабліва ў асноўных яе галінах зьяўляецца адсутнасьць патрэбнай энэргіі і ініцыятывы ў справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў: невыстарчальнае скарыстаньне наяўнага абсталяваньня, нізкі каэфіцыент зьменнасьці, адсутнасьць энэргіі ў перамозе «вузкіх месц» прадпрыемства, частыя прастоі абсталяваньня з-за неналажанасьці і неарганізаванасьці матар'яльна-тэхнічнага забесьпячэньня, шматлікія аварыі з-за злачыннай нядбайнасьці і кепскага тэхнічнага кантролю, адсутнасьць сыстэматычнай рацыяналізатарскай работы і крайняя нездавальняючасьць унутрызаводзкага плянаваньня. Замест бальшавіцкага змаганьня з кансэрватызмам у тэхніка-вытворчым кіраўніцтве прадпрыемствамі, замест рэвалюцыйнай пільнасьці ў адносінах шкоднікаў і мабілізацыі актыўнасьці перадавых рабочых для садзейнасьці разгортваньню работы прадпрыемстваў, нярэдка гаспадарнікі плятуцца ў хвасьце ўскоснае часткі спэцыялістых, а часамі проста шкоднікаў, не аказваюць належнага падтрыманьня больш перадавой частцы інжынэраў і тэхнікаў, адрываюцца ад рабочага актыву, г. зн. на практыцы абмяжоўваюцца бюракратычнымі мэтадамі работы.

Найбольш адмоўна вынікі ўсяго гэтага адбіліся на машынабудаўніцтве агульным і сельска-гаспадарчым, а таксама на чорнай мэталюргіі і каменавугальнай прамысловасьці. Так, выяўленая магчымасьць павялічэньня ў будучым годзе праграмы па машынабудаўніцтве ўдвая наказвае наколькі вялікія нескарыстаныя рэзервы магутнасьці нашых прадпрыемстваў. Выкананьне з посьпехам павышаных заданьняў, напрыклад, такімі прадпрыемствамі, як Электразавод, Пауднёварудная прамысловасьць (Крывы Рог), старыя папяровыя фабрыкі зьяўляюцца рэзультатам змаганьня за скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў прадпрыемства. Аднак, такіх прыкладаў яшчэ вельмі мала, прыклады-ж коснасьці і бюракратызму ў скарыстаньні ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці сустракаюцца на кожным кроку.

Шматлікія факты яўна павялічаных патрабаваньняў **на імпартнае** абсталяваньне, бяз спробаў скарыстаць унутраныя рэсурсы прамысловасьці, зьяўляюцца адным з самых яркіх прыкладаў бюракратычных адносін гаспадарчых кіраўнікоў да сваіх абавязкаў і часта адбіваюць апартуністычнае няве'ре ў магчымасьці сацыялістычнай індустрыі. Між тым, нярэдкі яўна нягрунтоўныя спробы апраўдаць невыкананьне прамысловых заданьняў невыстарчальнасьцю імпарту. Калі-б нашы партыйныя, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі па прыкладзе некаторых заводаў, як ленінградзкі мэталічны завод імя Сталіна (пашырэньне турбабудаўніцтва), правялі сапраўдную ініцыятыву ў справе скарыстаньня вытворчых рэсурсаў нашых заводаў, дык прамысловасьць атрымала-б дадатковыя магчымасьці ня толькі для выкананьня, але і значнага перавыкананьня пляну.

У радзе выпадкаў, як: у нафтавай прамысловасьці, руднай прамысловасьці Ўралу і каляровай мэталюргіі, невыкананьне вытворчага пляну выклікаецца ў першую чаргу яўна нездавальняючым ходзям падрыхтоўчых работ-разьведак, буроньня праходкі шахт, што стварае пагрозу далейшаму разьвіцьцю адпаведных галін індустрыі. Такое становішча асабліва недапушчальна з прычыны выключнай важнасьці гэтых галін прамысловасьці.

Асабліва значэньне для выкананьня прамысловага пляну ў гэтым годзе мелі зьмены, што адбыліся ў гаспадарчай абстаноўцы, і якія асабліва моцна сказаліся ў пытаньні аб рабочай сіле і перш за ўсё ў пытаньні аб яе **цякучасьці.** Вялізарны размах сацыялістычнай індустрыялізацыі, уцягненьне ў сувязі з гэтым у вытворства старых кадраў рабочых і вялікіх пластоў новых рабочых асабліва з вёскі і **адначасова** з гэтым разгорнутае калгаснае і саўгаснае будаўніцтва, пры наяўнасьці да таго-ж павышанага ўраджаю, — унесьлі буйнейшыя зьмены параўнальна з тым пэрыядам, калі кадры беспрацоўных у гарадох былі параўнаўча яшчэ значныя, а ў дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарках асабліва востра адчуваецца лішак вольных рабочых рук.

Гэтыя зьмены ў абстаноўцы ня былі ўлічаны гаспадарчымі органамі і прафсаюзамі. Між тым, у сувязі з імі стаіць, з аднаго боку прыліў у прамысловыя прадпрыемствы новых рабочых, якія не прайшлі школы буйное вытворчасьці, і нярэдка прасякнутыя дробнаўласьніцкімі, рвацкімі настроямі, і, з другога боку, адліў пэўнай часткі гэтых рабочых у вёску, асабліва ў пэрыяд уборачных работ і разьмеркаваньня ўраджаю. Замест сапраўднага ўліку абстаноўкі, якая стварылася, і прыняцьця патрэбных мер (па лініі разьвіцьця пралетарскай грамадзкасьці, адпаведнага прыстасаваньня арганізацыі забесьпячэньня рабочых, прэміраваньня лепшых рабочых з вытворчасьці і г. д.) для замацаваньня рабочага складу на прадпрыемствах і рашучага змаганьня з рвацкімі, выпадковымі для прадпрыемства элемэнтамі (лятунамі і г. д.) гаспадарчыя органы і прафсаюзы, а таксама партыйныя арганізацыі правялі зусім недапушчальную пасыўнасьць у гэтай справе і тым самым запусьцілі на нас разьвіцьцё цякучасьці рабочай сілы.

Асабліва трэба адзначыць бюракратычныя адносіны да гаспадарчых задач з боку органаў Наркампрацы, а таксама некаторых прафсаюзаў. Досыць сказаць, што пры яўна выяўленым недахваце рабочых на фабрыках і заводах, у капальнях і на будаўніцтвах ня ўсіх прамысловых раёнах, органы Наркампрацы да апошняга часу абмяжоўваліся друкаваньнем бюракратычных «даных» аб сотнях тысяч беспрацоўных і выплачвалі дзесяткі мільёнаў рублёў дапамогі «на беспрацоўе», не вядучы змаганьня з рвацкімі элемэнтамі, лятунамі, якія адмаўляліся ад работы, і г. д.

Ня менш бюракратым і нядбайнасьць да вырашэньня новых задач выявіла спажывецкая кааперацыя, якая ня здолела правесьці патрэбную перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з задачай замацаваньня рабочага складу на вытворчасьці, мабілізаваць свае вытворчыя магчымасьці для сапраўднага паляпшэньня забесьпячэньня рабочых, разагрануць масавы кантроль з боку рабочых і работнік над работай усіх органаў кааперацыі. Адказнасьць за гэта ляжыць у пэўнай меры і на органах Наркамгандлю.

Набольшы яскравым праяўленьнем замяшанасьці гаспадарчых органаў і прафсаюзаў і няўжыцьця імі своячасовых мер для змаганьня з цякучасьцю, што падрывае працоўную дысцыпліну і ўносіць дэзарганізацыю ў вытворчасьць, трэба прызнаць тое становішча з рабочай сілай, якое стварылася ў сувязі з новай гаспадарчай абстаноўкай на прадпрыемствах «Саюзвугалю», Уралу, на радзе будаўніцтваў і нават на паасобных прадпрыемствах Масквы і Ленінграду і якое прывяло да буйнейшых прарываў у вытворчых праграмах.

Галоўным і рашаючым недахопам у гаспадарчай рабоце застаецца няўменьне **арганізаваць і стаць на чале бурна ўзрастаючай актыўнасьці рабочае клясы.** Ня гледзячы на гіганцкі размах сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыках і заводах, нашы гаспадарчыя, прафэсыянальныя, камсамольскія і партыйныя арганізацыі нярэдка адстаюць у гэтай справе, а часамі апартуністычна плятуцца ў хвасьце пралетарскага актыву (прыклад — Сормава і інш.).

Разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ня мала сырыце давядзеньне заданьняў вытворчай праграмы да цэху, да брыгады, да паасобнага варштату. З другога боку, на аснове разьвіцьця пралетарскай актыўнасьці, скарыстаньня вытворчых дасягненьняў ударнікаў, іх рацыяналізатарскай ініцыятывы, а таксама сапраўднага ўліку на практыцы рабочых прапаноў у справе скарыстаньня рэзэрваў вытворчай магутнасьці, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва пераходзяць на больш высокую ступень. Гэта знаходзіць сваё адлюстраваньне ў выпрацоўцы рабочымі фабрык і заводаў **сустрэчнага прамфінпляну,** значэньне якога заключаецца ў большай эканоміі рэсурсаў прадпрыемства пры ажыцьцяўленьні вытворчай праграмы, у павышэньні якасьці прадукцыі і асабліва ў далейшым паскарэньні бальшавіцкіх тэмпаў прамысловага будаўніцтва. Сустрэчны прамфінплян набывае асабліва значэньне, як мэтад сапраўднага ўцягненьня ўсіх рабочых у справу сацыялістычнага будаўніцтва і як важнейшы сродак змаганьня з контр-рэвалюцыйным шкодніцтвам.

Аднак, на справе ў шмат выпадках з боку партыйных і іншых заводзкіх арганізацый, ня толькі няма належнага падтрыманьня рабочай ініцыятывы ў выпрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну, але і адсутнічае адпаведная арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва ў яго розных і ўсё новых формах («сквозные» ўдарныя брыгады, грамадзкі буксір і інш.), а бяз гэтага нельга забясьпечыць бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыі, якая разгортваецца. Усё яшчэ назіраецца шмат выпадкаў ілжэ-ўдарніцтва ў прамысловасьці і на транспарце, усё яшчэ шмат фармальна-бюракратычных адносін да спаборніцтва. Усё яшчэ значная частка членаў партыі не разумее ролі і абавязкаў камуністых на прадпрыемстве, як начальнікаў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

З боку гаспадарнікаў, якія стаяць на сапраўды перадавых пастох сацыялістычнай будоўлі, нярэдка яшчэ няма сьвядомасьці выключнай адказнасьці за сваю справу і няма разуменьня бязумоўнай абавязковасьці—цьвёрдае правядзеньне адзінаначальня на прадпрыемстве злучыць з уменьнем абаперціся ва ўсёй сваёй рабоце на партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, на ўвесь камуністычны і беспартыйны актыў рабочых і работніц.

Буйнейшыя недахопы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва знайшлі сваё адлюстраваньне ў выяўленых вытворчых прарывах і ў сур'ёзьнейшай пагрозе зрыву прамфінпляну гэтага году, якая стварылася.

Становішча, якое стварылася ў прамысловасьці, патрабуе рашучых і неадкладных мер па мабілізацыі ўсёй партыі і ўсяе рабочае клясы ў выкананьня прынятага партыяй і ўрадам пляну бягучага году. І гэта тым больш неабходна, і тым больш і неадкладна, што ліквідацыя выяўленага прарыву ў прамфінпляне, зьяўляецца асноўнай умовай для забесьпячэньня выкананьня вытворчай праграмы трэцяга году пяцігодкі.

З гэтага вынікаюць наступныя асноўныя **задачы** партыі і ўсяе рабочае клясы:

1. Усе сілы партыйных і камсамольскіх арганізацый, прафсаюзаў і гаспадарчых органаў — на разьвіцьцё справы **сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва,** на падтрыманьне ініцыятывы рабочых у гэтай справе ва ўсіх яе формах («сквозные» ўдарныя брыгады, грамадзкі буксір і інш.), усе сілы — на разгортваньне **сустрэчнага прамфінпляну** на фабрыках і заводах, у капальнях і на будаўніцтвах, на чыгуначным і водным транспарце.

ЦК цалкам і поўнасьцю падтрымлівае ініцыятыву ЎсеЦСПС, на арганізацыі на працягу верасьня разгорнутай кампаніі прафсаюзаў за сустрэчны прамфінплян, на ўвесь камуністычны і беспартыйны актыў рабочых і работніц.

2. Неадкладна правесьці мерапрыемствы, якія забясьпечваюць рашучае **ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны** і сапраўднае змаганьне з расхлябанасьцю, прагуламі. Гэтыя мерапрыемствы павінны забясьпечыць хутчэйшы пералом у справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы і ажыцьцяўленьня на справе адзінаначальня ў гаспадарчым кіраўніцтве, без чаго немагчыма перамаганьне затрудненьняў, якія стварыліся ў прамысловасьці.

3. Забясьпечыць разьвіцьцё вытворча-тэхнічнай ініцыятывы **інжынэраў і тэхнікаў** і ўсямерна фарсаваць выпрацоўку новых кадраў з рабочае клясы, больш сьмела і настойліва высоўваючы перадавікоў — рабочых і асабліва рабочых-арганізатараў спаборніцтва на гаспадарчыя пасты, перамагаючы пры гэтым ускоснасьць, бюракратызм і апартуністычнае нявер'е ў сілы рабочае клясы.

4. У мэтах барацьбы з **цякучасьцю** на прадпрыемствах, правесьці сыстэму мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць замацаваньне рабочых на вытворчасьці шляхам адпаведнага разьвіцьця пралетарскай грамадзкасьці, правядзеньня самаабавязацельству рабочых перад пралетарскай грамадзкасьцю аб рабоце на даным прадпрыемстве, ня менш пэўнага тэрміну і ўжываньня ўсіх мер грамадзкае ўзьдзейнасьці аж да байкоту злосных дэзэртыраў з вытворчасьці, а таксама ўстанаўленьня сыстэмы розных форм прэміраваньня і забесьпячэньня, якія стымулююць працажныя тэрміны прабываньня рабочага на заводзе.

З прычыны неадпаведнасьці раду законадаўчых норм і, у прыватнасьці, палажэньня аб біржах працы ў цяперашний гаспадарчай абстаноўцы, тэрмінова зрабіць перагляд гэтых норм пад кутом погляду скасаваньня іх у тэй іх частцы, якая ўскладняе змаганьне з лятунамі, дэзэртырамі з вытворчасьці і г. д., і разам з тым, забясьпечыць узмоцненае ўцягненьне ў вытворчасьць рабочай моладзі, а таксама жэнак рабочых і іншых працоўных.

5. Арганізацыя справы **забясьпячэньня** рабочых мае важнейшае значэньне ў справе выкананьня прамфінпляну. У мэтах паляпшэньня арганізацыі разьмеркаваньня, каапэрацыі трэба разгарнуць апраўдаўшыя сябе такія яго формы, якія ў найбольшай меры забясьпечваюць інтарэсы вытворчых рабочых (закрытыя разьмеркавальнікі, прымацаваньне рабочых пайшчыкаў да магазынаў, бязьлітаснае змаганьне з крамамі ў каапэрацыйным апараце, узмоцненыя рэпрэсіі за злоўжываньні картачкамі, талёнамі і г. д.) і фарсаваць у прамысловых раёнах арганізацыю прыгарадных гаспадарак (агародных, малочных, жывёлагадоўчых). Партыйныя, прафэсыянальныя, камсамольскія і гаспадарчыя арганізацыі павінны аказаць усякую дапамогу разьвіцьцю самадзейнасьці рабочых у гэтай справе, умацаваць каапэрацыю і ўсямерна ўзмацніць разьвіцьцё масавага кантролю рабочых і работніц над работай каапаратару.

6. **Друк** правёў на аснове разгортваньня самакрытыкі вялікую работу ў справе мабілізацыі рабочых мас для выкананьня прамфінпляну. Разам з тым, у шмат якіх выпадках, абмяжоўваючыся навярхоўнай кампаніейскай агітацыяй, друк не дабіўся завастрэньня змаганьня рашаючых канкрэтных недахопаў гаспадарчай работы і не спраўляўся з задачай своячасовай арганізацыі мас вакол новых пытаньняў, якія высоўваліся зьменамі ў гаспадарчай абстаноўцы.

7. Рашучае змаганьне з паслабленьнем тэмпу работы ў сувязі з летнімі адпускамі, які набыў у радзе гаспадарчых органаў агідную форму пакіданьня ўстаноў без кіраўніцтва і які прадстаўляе адну з сур'ёзьнейшых перашкод для выкананьня бягучага прамфінпляну і падрыхтоўкі да трэцяга году пяцігодкі. Без неадкладнага і рашучага выкараненьня дэмабілізацыйных настрояў гэтага году, якія зьяўляюцца адным з яўных праяўленьняў апартунізму на практыцы, мабілізацыя партыйных сіл і рабочых для ліквідацыі прарыву і выкананьня вытворчых заданьняў застанецца толькі словамі.

Такавы важнейшыя задачы сёньняшняга дня.

Вытворчая праграма бягучага году і гаспадарчы плян трэцяга году пяцігодкі азначаюць практычную праграму сацыялістычнага будаўніцтва і разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце. Ня гледзячы на выяўленыя буйнейшыя недахопы ў ажыцьцяўленьні вытворчых заданьняў, будаўніцтва сацыялізму пераможна прасоўваецца наперад, бязьлітасна зьнішчаючы на сваім шляху ўсякія спробы супраціўленьня клясавага ворага (кулакоў, контр-рэвалюцыйных шкоднікаў, буржуазных рэстаўратараў, у тым ліку і тыпу Громана, Кандрацьцева, Суханава). Правыя панікёры, гэтыя падгалоскі кулацтва і трацкісцкія элемэнты, якія на справе абярнуліся з учарашніх «левых» у фактычных падпявалаў правых апартуністых, а таксама ўсякага роду прыміранцы да правых і трацкістых, зьяўляюцца выказьнікамі буржуазнага ўплыву на пралетарыят, і таму пранікненьне ў партыйнае асяродзішча ўсякага роду апартуністычных, настрояў, якія падрываюць баяздольнасьць пралетарыяту ў яго разгорнутым наступленьні на капіталістычныя элемэнты, павінна сустрэць рашучы бальшавіцкі адпор. Гэта зьяўляецца асноўнай умовай пераможнага прасоўваньня сацыялізму ўперад і, забясьпечваючы бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, тым самым зьяўляецца прадпасылкай перамогі труднасьцяй, што стаяць на шляху гэтага будаўніцтва.

Перамаганьне труднасьцяй, якія стаяць перад намі, перш за ўсё залежыць ад нашай работы, ад нашага ўменьня весьці пасьлядоўнае і непрымірымае змаганьне з расхлябанасьцю, разгільдзяйствам і бюракратызмам у нашых органах, і асабліва ад нашай здольнасьці мабілізаваць рабочую клясу, якая зьяўляецца крыніцаю хутка ўзрастаючай і проста невычарпальнай рэвалюцыйнай энэргіі, для справы барацьбы за камунізм.

Прамфінплян стаіць пад ударам. Гэтым ставіцца пад удар праграма трэцяга году пяцігодкі. Зробім з гэтага бальшавіцкі вывад:

Усе сілы партыі, усе сілы рабочае клясы — на выкананьне прамфінпляну, на забесьпячэньне праграмы трэцяга году пяцігодкі!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БАЛЬШАВІКОЎ.

1-га КАСТРЫЧНІКА—УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ УДАРНІКА

Намагчы ўсе сілы для пасьпяховага завяршэньня другога году пяцігодкі і падрыхтоўкі да новага гаспадарчага году

ПАДЦЯГНУЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЦЭХІ І БРЫГАДЫ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ

Пастанова прэзыдыуму ЎсеЦСПС аб арганізацыі сустрэчы новага гаспадарчага году

Канчаецца другі год пяцігодкі, год вялікага пералому, што даў магутную хвалю працоўнага ўздыму рабочых мас, якія на справе ажыцьцяўлялі свой лёзунг — «пяцігодку—за чатыры гады».

Побач з буйнейшымі посьпехамі ў разьвіцьці сацыялістычнай прамысловасьці, дасягнутымі ў бягучым гаспадарчым годзе, прэзыдыум ЎсеЦСПС адзначае, што ў ходзе выкананьня прамфінпляну бягучага году выявіўся рад сур'ёзьнейшых прарываў, якія ставяць пад пагрозу пасьпяховае завяршэньне гаспадарчага году і ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі ў трэцім годзе пяцігодкі. **Галоўнай прычынай гэтых прарываў прэзыдыум ЎсеЦСПС лічыць няўменьне стаць на чале і арганізаваць узрастаючы працоўны ўздым рабочых мас.**

Між тым, у ходзе разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якія забясьпечылі рашаючыя посьпехі рабочае клясы на асноўных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, ініцыятывай мас высунуты і праверены на вопыце канкрэтных формы барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну (грамадзкі буксір, «сквозные» ўдарныя брыгады і г. д.).

Новым буйнейшым крокам, які забясьпечвае непасрэдны ўдзел пматамільённых мас у сацыялістычным будаўніцтве, зьяўляецца сустрэчны прамфінплян.

Высунуты рабочымі масамі ў адказ на прарывы на паасобных вучастках прамысловасьці, **сустрэчны прамфінплян адзначае ўздым сацыялістычнага спаборніцтва на вышэйшую ступень,** забясьпечвае максымальнае выяўленьне і скарыстаньне ўсіх рэзэрваў і вытворчых магчымасьцяй сацыялістычнае гаспадаркі, б'е па карэньнях шкодніцтва і зьяўляецца лепшым адказам усім панікёрам і апартуністым.

У мэтах мабілізацыі ўсіх сіл рабочае клясы на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну бягучага году, максымальнага выкарыстоўваньня абсалютна ўсіх форм сацыялістычнага спаборніцтва і найлепшай падрыхтоўкі рабочых мас да арганізацыйнай сустрэчы трэцяга **рашаючага году** пяцігодкі, прэзыдыум ЎсеЦСПС пастанаўляе:

1. Сустрэчу трэцяга году пяцігодкі адзначыць арганізацыяй **усесаюзнага дня ўдарніка — 1 кастрычніка 1930 г.**

Усесаюзны дзень ударніка, які арганізуецца на ўсіх фабрыках, заводах, капальнях, на транспарце, на ўстановах, у каапэрацыі, у саўгасах і калгасах, павінен прайсьці пад знакам найшырэйшай мабілізацыі мас на пасьпяховае завяршэньне другога году пяцігодкі, на паляпшэньне якасьці работы, на рашучае змаганьне з рэшткамі працоўнай расхлябанасьці, з цякучасьцю, дэзарганізацыяй, якія ўскладняюць разгорнутую падрыхтоўку да трэцяга году пяцігодкі, на стварэньне рашучага пералому ў рабоце каапэрацыйных і забесьпячальных органаў і ўзмацненьне актыўнасьці прафсаюзаў і лепшай арганізацыі справы рабочага забесьпячэньня.

2. **Усесаюзны дзень ударніка,** зьяўляючыся днём усеагульнай мабілізацыі актыўнасьці працоўных на поўнае выкананьне распрацаванага пры непасрэдным удзеле шырокіх рабочых мас прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі (сустрэчны прамфінплян), павінен выклікаць прыліў новых атраду рабочае клясы на ўдарны рух (прызыў ударнікаў трэцяга году пяцігодкі), замацаваць і зрабіць уласнасьцю кожнага прадпрыемства праверанага вопытам мас новыя, вышэйшыя формы сацыялістычнага спаборніцтва (грамадзкі буксір, «сквозные» брыгады і г. д.), забясьпечыць масавае заключэньне дагавораў па сацспаборніцтве паміж брыгадамі, цэхамі і прадпрыемствамі на аснове новых паказальнікаў, якія вынікаюць з сустрэчнага прамфінпляну, і прэміраваньне лепшых прадпрыемстваў і ўдарнікаў, якія з посьпехам выканалі прамфінплян другога году пяцігодкі.

3. Прэзыдыум ЎсеЦСПС падкрэсьлівае, што верасень павінен быць **максымальна скарыстаны ўсімі саюзнымі арганізацыямі для рашучага падцягваньня прадпрыемстваў, цэхаў, брыгад, якія адстаюць у выкананьні прамфінпляну,** асабліва **па вугалі, мэталю і транспарце,** шляхам арганізацыі грамадзкага буксіру, «сквозных» брыгад, разгортваньня на прадпрыемствах збору і рэалізацыі рабочых **прапаноў,** выпаходніцтваў і г. д.

Прэзыдыум ЎсеЦСПС заклікае рабочых, інжынэрна - тэхнічных работнікаў і ўсіх працоўных намагчы ўсе сілы для пасьпяховага завяршэньня другога гаспадарчага году пяцігодкі і падрыхтоўкі новага гаспадарчага году.

Выканаем дырэктывы ЦК УсеКП(б)

Арганізавана сустрэнем 3-ці год пяцігодкі

Пастанова сакратарыяту УсеЦСПС

Сакратарыят УсеЦСПС пастанавіў: цэнтральным камітэтам прафсаюзаў, абласным і краявым саўпрофам у двухдзённы тэрмін **распрацаваць канкрэтны плян ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦК УсеКП(б) і прэзыдыуму ЎсеЦСПС аб барацьбе з прарывамі ў выкананьні прамфінпляну і аб арганізацыі ўсесаюзнага дня ўдарніка** з максымальным улікам сваіх умоў і асаблівасьцяй.

У пяцідзённы тэрмін камандзіраваць у аснoўныя прамысловыя раёны (Донбас, Ўрал, Баку, Днепрапятроўск, Кузбас і інш.) **групы членаў прэзыдыуму ЎсеЦСПС і ЦК саюзаў** (30 чалавек) для непасрэднай работы на прадпрыемствах па аказаньні дапамогі мясцовым арганізацыям, хутчэйшай ліквідацыі прарываў і падрыхтоўкі да новага гаспадарчага году.

Абавязаць абласныя і краявыя саўпрофы правесьці **мабілізацыю кіруючых работнікаў для пасылкі на прадпрыемствы і цэхі.** Неадкладна склікаць на ўсіх прадпрыемствах **экстраныя пленумы заводзкіх камітэтаў** сумесна з кадравымі рабочымі, лепшымі ўдарнікамі і актывам вытворчых нарад (рабочых і інжынэрна - тэхнічных сіл), на якіх вызначыць канкрэтныя мер

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Вышэй сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва

Бязьлітасна біць па панікёрах з праваапартуністычнага лягеру

Быць у першых радох ударнікаў

(КАСТРЫЧНІЦКІ РАЁН, МЕНСК)

Рабочая кляса, дэманструючы сваё давер'е камуністычнай партыі і ноўную гатоўнасьць змагацца за практычнае ажыцьцяўленьне не генэральнай лініі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за выкананьне прамфінпляну свайго прадпрыемства, усе шырэй і шырэй пачала ўзьнімаць сацыялістычныя мэтады працы, абвяшчаючы ўдарнымі пэхі, заводы:

Вялікіх посьпехаў у справе выкананьня прамфінпляну дасягнулі тыя прадпрыемствы, партыйныя арганізацыі якіх сталі на чале ўзьдыму і творчай ініцыятывы рабочых мас і неаслабна кіруюць ходам сацспаборніцтва, дзе камуністы і камсамольцы зьяўляюцца прыкладнымі на вытворчасьці.

Так, напрыклад, **на заводзе «Бальшавік»** па ініцыятыве ўдарнікаў-камуністых і камсамольцаў, група ў ліку 249 рабочых-ударнікаў (з іх 130 партыйцаў і 13 камсамольцаў) добраахвотна зьвяшала расцэнкі і гэтым самым за бягучы год працы да 1 жніўня далі 10.000 руб. эканоміі. На заводзе **«Энэргія»** брыгада на чале з партыйцам **Івановым** узьняла прадукцыйнасьць працы на 160 проц., брыгада т. Сапраўдскага (член КП(б)Б) выканала на 100 процантаў сацдагавор, узьняўшы на належную вышыню працдысцыпліну і кан чаткова зьнішчыўшы прагулы.

На чыгунцы, у майстэрнях малога рамонту вагонаў, пры сярэднім узьняцьці прадукцыйнасьці працы на 5 проц., брыгада на чале з партыйцам т. **Журыкам** павысіла яе на 26 проц., а брыгада камсамольца Сакалоўскага — на 24 процанты.

Такія прыклады ўзорнай працы ўдарных брыгад ёсьць і ў радзе іншых прадпрыемстваў.

Праведзеным Кастрычніцкім РК КП(б)Б абсьледваньнем уздзелу камуністых у сацспаборніцтве на прадпрыемствах выяўлена, што там, дзе меншы процант камуністых прымае ўдзел у спаборніцтве, там ахоплена спаборніцтвам і меншая колькасьць беспартыйных рабочых.

Да 1-га жніўня на заводзе **«Энэргія»** прымалі ўдзел у спаборніцтве толькі 46 проц. камуністых, у майстэрнях малога рамонту вагонаў — 59 проц., на сьпіртзаводзе з 22 партыйцаў толькі 2 чал. прымаюць удзел у сацспаборніцтве. Невыстарчальная колькасьць камуністых прымае ўдзел у спаборніцтве таксама на шчацінай фабрыцы, **«Адраджэньне»** і інш.

Такое астановішча сьведчыць аб неразуменьні паасобнымі ячэйкамі і камуністымі палітычнай важнасьці сваіх задач на прадпрыемстве, свае адказнасьці за выкананьне прамфінпляну, яго якасных і колькасных паказальнікаў. У выніку слабога кіраўніцтва спаборніцтвам з боку партарганізацыі, у выніку таго, што быў праяўлены правы апартунізм на практыцы з боку асобных кіраўнікоў, на заводах «Энэргія» і «Бальшавік» былі выпадкі і развалу ўдарных брыгад паніжэньня якасных паказальнікаў на каўбасной і лямпавай фабрыках і значныя прарывы ў справе выкананьня прамфінпляну на шчацінай фабрыцы.

Яшчэ да гэтага часу заўважаюцца моманты апартуністычных адносін з боку асобных партыйных і прафэсіяных работнікаў прадпрыемстваў да сацспаборніцтва. Толькі гэтым можна вытлумачыць прычыны таго, што на заводзе «Энэргія» з 853 беспартыйных рабочых ахоплена спаборніцтвам толькі 189 чал., у чыгуначным дэпо з 320 чал.—30, на фабрыцы «Адраджэньне» з 150 — 65 чалав., на шчацінай з 98 чал. — 30, на сьпіртзаводзе з 94 чал.—6.

Паасобныя ячэйкі менска мабілізуюць пралетарскую грамадзкасьць на барацьбу з лжэ-ударніцтвам. У некаторых выпадках паасобныя камуністыя, камсамольцы фармальна прымаюць удзел у сацспаборніцтве, несьвядома адносяцца да работы, не зварачаюць належнай увагі на яе якасьць, парушаюць працоўную дысцыпліну і г. д.

Кожны камуністы на вытворчасьці павінен быць сапраўдным арганізатарам узорнай сацыялістычнай працы на сваім прадпрыемстве. Зараз, як ніколі, павінны быць накіраваны «усе сілы партыйных і камсамольскіх арганізацый, прафсаюзаў і гаспадарчых органаў на разьвіцьцё справы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Я. Ів.

Не дапусьціць прарыву

Партарганізацыя фабрыкі «Кастрычнік» (Менск) здолела мабілізаваць актыўнасьць рабочых на выкананьне прамфінпляну, здолела вытворчыя нятаньні паставіць у асяродак усёй сваёй работы. Перабудова партработы на прадпрыемстве ў асноўным садзейнічала арганізацыі вытворчай актыўнасьці і ініцыятывы рабочых і накіраваньня гэтай актыўнасьці на выкананьне якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну. Парткалектыў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну абаперся на творчы энтузіязм рабочых, падтрымаў ініцыятыву перадавых рабочых - ударнікаў — гэтым самым забясьпечыў пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы.

Камуністыя ўдарнай бальшавіцкай работай сталі ў першыя рады змагароў за выкананьне прамфінпляну. Камуністыя і камсамольцы, абвясьціўшы сябе ўдарнікамі, паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў рабоце на выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, на ўздыме прадукцыйнасьці працы — гэтым самым засьведчылі сваю адданасьць генэральнай лініі партыі.

Вакол задач на выкананьні прамфінпляну, партарганізацыяй у выстарчальнай меры была мабілізавана фабрычная грамадзкасьць. На службу гэтай задачы была паставлена ўся культурна - масавая работа на фабрыцы. **За 10 месяцаў бягучага году на фабрыцы прамфінплян выкананы на 111 проц.**

Параўнальна з першым паўгодзьдзем, у трэцім і чацьвертым квартале дасягнута значнае паніжэньне браку як вытворчага, так і тэкстыльнага. Перароблі, якія ў першым паўгодзьдзі мелі значнае месца на фабрыцы, за апошнія месяцы значна зьнізіліся. Калі ў першых месяцах бягучага году на перароблах было занята шмат рабочых, дык зараз з пераробкамі спраўляецца адзін рабочы.

Прадукцыйнасьць працы ў бягучым гаспадарчым годзе на фабрыцы ўзрасла больш чым на 40 проц. Прагулы значна зьнізіліся.

Зараз на фабрыцы заканчваецца прапраноўка сустрэчнага прамфінпляну. Ён быў прапрацаваны на нарадах брыгадзіраў цэху, у брыгадах рабочых, на цэхавых сходах, і г. д. Рабочыя сваёй актыўнасьцю засьведчылі, што кантрольныя лічбы на 1930-31 г. будуць не толькі выкананы, але і перавыкананы. Кантрольныя лічбы на рабочых сходах у значнай мэры павялічаны. Спэцыяльна арганізаваная ВКК зараз займаецца распрацоўкай і зборам рабочых прапаноў на пытаньнях вытворчасьці.

У апошнія дні ў цэхах трывога. Наглядаецца некаторае паслабленьне працдысцыпліны. Прывыхады на работу штодзенна дасягаюць 70-80 рабочых. За тры дні верасьня месяца прамфінплян выкананы на 87 проц. Як магло здарыцца, што фабрыка, якая ўвесь год высока трымала сьцяг ударніцтва, якая выканала і перавыканала прамфінплян, за 11 месяцаў у дванаццатым, апошнім рашаючым месяцы бягучага гаспадарчага году, ідзе да прарыву? Як магло здарыцца, што партыйныя і прафэсіяналныя арганізацыі ў апошнія рашаючыя дні паслабілі кіраўніцтва ўдарніцтвам і сацыялістычным спаборніцтвам.

На фабрыцы «Кастрычнік», знайшліся людзі, якія спасавалі перад труднасьцямі, сталі на шлях апартуністычных разважаньняў. Цякучасьць рабочай сілы, якой да апошняга часу на «Кастрычніку» ня было, у першыя дні верасьня дае сябе адчуваць. **Ганебным зьяўляецца тое, што паасобныя камуністыя і камсамольцы, разам з найбольш адсталымі рабочымі, кінулі работу на фабрыцы — дэзэртавалі з фронту сацыялістычнага будаўніцтва.**

Для ліквідацыі прарыву, які яскрава выявіўся за апошнія дні на фабрыцы, гэрткалектывам мабілізаваны ўсе сілы. Ударнікамі разгорнута работа сярод рабочых аб дачы дзяржаве абавязацельства не пакідаць работу на фабрыцы да канца пяцігодкі.

Мы ўпэўнены, што рабочыя фабрыкі «Кастрычнік» не дапусьцяць прарыву ў выкананьні прамфінпляну на сваёй фабрыцы.

Вынікі за 11 месяцаў барацьбы за прамфінплян паказалі, што пляны зусім рэальныя, што яны могуць быць выкананы і перавыкананы. Але для выкананьня прамфінпляну патрэбна сапраўдны бальшавіцкая работа сапраўды баявым высокім тэмпы.

Ул. М—іч.

У апошнюю мінуту

Паход супроць украінскіх культурных арганізацый у Заходняй Украіне

ВАРШАВА, 3. Паводле распараджэньня новага львоўскага ваяводы Наканечнікава, закрыты рад правінцыяльных аддзелаў украінскага добраахвотнага пажарнага і спартыўных таварыстваў, а таксама культурна-асьветнага таварыства «Просьвіта» ў Рускім павеце. На адкрыцьці ўсходняга кірмашу ў Львове, дзе чакаліся тэрарыстычныя акты з боку украінскіх тэрарыстых, паліцыяй былі прыняты выключныя меры.

Загад аб арышце камдэпутата Росяка

ВАРШАВА, 3. Пракурорскія ўлады ў Лодзі загадалі арыштаваць дэпутата камуністычнай фракцыі распушчанага сойму Росяка. Газэты паведамляюць, што паліцыі да гэтага часу не ўдалося выкрыць месца, дзе знаходзіцца Росяк.

Напярэдадні выбараў

ВАРШАВА, 3. У сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у сойм, польскі ўрад выклікаў з водпуску рад ваявод. У палітычных колах зноў пачынаюць цыркуляваць чуткі пра надзвычайныя мерапрыемствы, якія ўрад прыме ў сувязі з выбарамі, у прыватнасьці пра магчымую зьмену выбарчага закону. Апрача таго, распаўсюджваецца чутка, што ўрадавы блёк выпусьцідзь адозву з заклікам да байкоту выбараў.

Абсьледваньне работы КП(б)Б

БРЫГАДЫ ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ

ГОМЕЛЬ. (Наш. спэц. кар.). 2-га верасьня адбыўся сход партактыву Гомельскай арг., на якім быў заслуханы даклад адказнага інструктара ЦК УсеКП(б) т. ЖАБРОЎСКАГА аб абсьледваньні Гомельскай гарадзкой партыйнай арганізацыі, у зьвязку з агульным абсьледваньнем КП(б)Б.

— ЦК УсеКП(б)—сказаў тав. Жаброўскі — надае вялізарнае палітычнае значэньне абсьледваньню КП(б)Б. Яно павінна прайсьці пад знакам праверкі наколькі КП(б)Б змагла перабудавацца па ўсіх галінах работы ў адпаведнасьці са шпаркімі тэмпамі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, наколькі мабілізавана партыйная арганізацыя, рабочая кляса на рэалізацыю пастаноў 16-га партыйнага зьезду. Пры абсьледваньні работы КП(б)Б павінны быць упічаны палітычныя, эканамічныя, нацыянальна-культурныя і геаграфічныя асаблівасьці БССР.

Абсьледваньне павінна падагуліць вялікі вопыт і дасягненьні нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР. Правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў БССР вымушаны прызнаць нават нашы заядныя клясавыя ворагі.

Гомельская партыйная арганізацыя зьяўляецца буйнейшым аб'ектам абсьледваньня КП(б)Б і яе справаздача будзе заслухана непасрэдна ў ЦК УсеКП(б).

Гомельская арганізацыя — старшая бальшавіцкая арганізацыя з вялікім рэвалюцыйным мінулым, з бальшавіцкімі традыцыямі.

Але каму многа дана — ад таго і многа патрабуецца.

Асноўнай умовай абсьледваньня зьяўляецца масавасьць, добраахвотнасьць, самаправерка, якія даюць магчымасьць высьветліць усебакова сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР.

Увага партыйнай арганізацыі, усёй пралетарскай грамадзкасьці павінна быць зьвернута на абсьледваньне.

Лёгкая кавалерыя, друк, рабкоры, ударнікі, партыйны і беспартыйны актыў павінны дапамагчы абсьледваньню. Абсьледваньне павінна дапамагчы ўзьняць на вышэйшую ступень крытыку ўсіх недахопаў, разгарнуць сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку. Гэта мае вялікае значэньне таму, што ў адносінах разгортваньня самакрытыкі ў Гомелі былі буйныя прарывы.

Гомельская партыйная арганізацыя, канчаючы даклад, сказаў тав. Жаброўскі,—здолее з патрэбнай бальшавіцкай адказнасьцю мабілізаваць усю партыйную арганізацыю і пралетарскую грамадзкасьць на абсьледваньне і пад знакам генэральнай самаправеркі, пад знакам сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, будзе праводзіць усю работу ў далейшым.

Па дакладу выказаліся 11 т. т. Ва ўхваленай актывам рэзалюцыі, бальшавікі Гомельшчыны вітаюць абсьледваньне КП(б)Б з боку ЦК УсеКП(б) і заклікаюць усю партыйную арганізацыю і рабочых прыняць актыўны ўдзел у абсьледваньні.

***

Гомельскі акругком мабілізаваў 30 адказных кіруючых партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафэсіянальных і гаспадарчых работнікаў у якасьці кіраўнікоў спэцыяльна арганізаваных ударных брыгад па абсьледваньні.

Для абсьледваньня вызначаны 20 аб'ектаў. Усе брыгады ўжо распачалі сваю работу. Рабочыя на прадпрыемствах праяўляюць вялікую зацікаўленасьць абсьледваньнем.

Партыя патрабуе

ўзмацненьня работы сярод працоўных жанчын

Па-баявому правесьці перавыбары дэлегацкіх сходаў

XVI зьезд УсеКП(б) і XIII зьезд КП(б)Б паказаў на необходнасьць узмацненьня работы сярод працоўных жанчын. Необходнасьць гэтага ўзмацненьня дыктуецца ўсім становішчам, што мы маем на гэтым важнейшым вучастку работы. Сярод паасобных членаў партыі і ў паасобных зьвяньнях нашай арганізацыі яскрава праяўляюцца моманты недаацэнкі значэньня работы сярод жанчын. З боку раду работнікаў партыйнага, савецкага і каапэрацыйнага апарату наглядаецца імкненьне зваліць работу сярод жанчын на плечы выключна спэцыяльных работнікаў.

Таму зусім правільнае і сваячасовае паказаньне XVI зьезду УсеКП(б):

«Зьезд абавязвае ўсе партыйныя, прафэсіянальныя, савецкія і інш. арганізацыі узмацніць сваю работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных жанчын, асабліва на вёсцы, на разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва».

Перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў жанчын, якая павінна праводзіцца на працягу гэтых месяцаў, набывае выключна важнае палітычнае значэньне. Паказаньне зьезду нашай партыі на необходнасьць узмацненьня работы сярод працоўных жанчын, павінна знайсьці сваё практычнае ажыцьцяўленьне асабліва на вёсцы перавыбараў дэлегацкіх сходаў.

Нежаўданы пэрыяд—ёсьць пэрыяд разгорнутага наступленьня сацыялізму на ўсім фронце. Шпарка разгортваецца індустрыялізацыя савецкай краіны, практычна ажыцьцяўляецца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі—узьнімаецца новая хваля калгасна га руху, ажыцьцяўляецца ліквідацыя кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Усё гэта патрабуе, як ніколі, мабілізацыі творчых сіл і энэргіі рабочае клясы на пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва і перамаганьне ўсіх труднасьцяй гэтага будаўніцтва. Нам у такой-жа меры необходна мабілізаваць на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве мільённыя масы работніц, калгасьніц і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак.

У справе мабілізацыі мас працоўных жанчын на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, перавыбары дэлегацкіх сходаў адыгрываюць важнейшую ролю. Партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, савецкія і ўсе грамадзкія арганізацыі павінны з усёй сурёзнасьцю адносіцца да падрыхтоўкі перавыбарчай кампаніі і забясьпечыць яе актыўнае правядзеньне.

Перад перавыбарчай кампаніяй ставіцца асноўная задача—максымальна ўзмацніць работу дэлегацкіх сходаў, як аднаго з «прыкладных пасаў» партыі да шырокіх мас працоўных жанчын. Асаблівая ўвага і ўзмацненьне работы патрабуецца на вёсцы. Гэты вучастак зьяўляецца найбольш слабым і таму патрабуе большай мабілізацыі сіл і ўвагі.

Асноўнае і найбольш важнае заключаецца ў тым, каб дэлегацкія сходы былі ў першых радох барацьбітоў за выкананьне лёзунгу «пяцігодку—за чатыры гады», каб дэлегаткі работніцы, калгасьніцы і саўгасьніцы паталоўпа ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, у падвышэньні прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту прадукцыі, у рашучай барацьбе з прарывамі ў выкананьні прамыслова-фінансавых плянаў. Становяцца на перадавыя пазыцыі барацьбы за пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва,—дэлегацкія сходы павінны максымальна дабівацца таго, каб у гэтую барацьбу ўцягваць усё больш і больш шырокія масы працоўных жанчын. Перавыбары дэлегацкіх сходаў павінны даць моцны штуршок да ўзмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных жанчын, узброіць масы жанчын на бязьлітасную барацьбу з контрэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, актывізаваць барацьбу супроць нацыянізму ўсіх колераў і ў першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе.

Кіруючыя лёзунгі, што вызначаны ў пастанове ЦК КП(б)Б да перавыбараў дэлегацкіх сходаў, павінны прасякнуць усю перавыбарную кампанію. І ўзброіць масы на выкананьне іх—вось важнейшая задача, якая павінна быць выкананая.

Сярод гэтых задач необходна завастрыць увагу на такіх важнейшых задачах, як павышэньне вытворчай і тэхнічнай кваліфікацыі работніц, калгасьніц і саўгасьніц, на вылучэньне іх на кіруючую адміністрацыйна-гаспадарчую работу. Арганізаваць шырокія масы работніц на барацьбу з часовымі труднасьцямі ў рабочым забясьпячэньні ажыцьцяўляць строгі грамадзкі кантроль над работай каапэрацыі наогул, і ў грамадзкім харчаваньні—асабліва. Дэлегацкія сходы павінны аказаць пазітыўную дапамогу партыі ў правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній (хлебазагатоўкі, асеньняя пасеўная кампанія, сіласаваньне і г. д.).

Важнасьць перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў патрабуе найбольш сваячасовай і дасканалай падрыхтоўкі. Работу дэлегацкіх сходаў трэба увязаць з гаспадарча-палітычнымі задачамі, якія стаяць перад мясцовымі партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі. Адзнай з важнейшых задач дэлегацкіх сходаў зьяўляецца перанясьненьне ўсяго цяжару іх работы непасрэдна ў цэх, у калгас і аддзяленьне калгасу—павярнуцца сапраўды тварам да вытворчасьці. Гэта асабліва важна для дэлегацкіх сходаў на вёсцы, дзе неабходна іх работу шчыльна ўвязаць з дзейнасьцю груп беднаты, сельскіх саветаў, каапэрацыі і інш. устаноў і арганізацый вёскі.

Каб прыцягнуць шырокую грамадзкасьць да перавыбараў дэлегацкіх сходаў і найлепшага правядзеньня саміх перавыбараў, вялікае значэньня набываюць формы работы, якія рэкамэндуюцца ў спэцыяльнай пастанове ЦК КП(б)Б.

Вось важнейшыя з іх:

Арганізацыя масавых абсьледваньняў работы дэлегацкіх сходаў, праз спэцыяльныя брыгады. Перакліча паміж раёнамі па лепшае правядзеньне перавыбараў, скарыстаўшы ў гэтай справе радыё і друк. Пастаноўка справаздач дэлегацкіх сходаў аб выніках іх работы на сходах рабочых, калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, на сходах груп беднаты. На гэтых сходах трэба паставіць пад агонь пралетарскай самакрытыкі усю работу дэлегацкіх сходаў. Райкомы павінны мабілізаваць груны адказных работнікаў на правядзеньне перавыбарчых сходаў. З мэтай узмацненьня партыйнага ўплыву сярод працоўных жанчын пацменшасьцяй, неабходна шырока разгарнуць работу сярод іх на роднай мове. Для гэтай справы трэба вылучыць спэцыяльных работнікаў.

Работа дэлегацкіх сходаў і іх перавыбары патрабуюць узмацненьня партыйнага кіраўніцтва. Задача райкомаў—забясьпечыць выкананьне наступных мерапрыемстваў:

Прапрацаваць пытаньне аб рабоце дэлегацкіх сходаў на пленумах РК і адкрытых сходах партыйных ячэек. Вылучыць кадр кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў, праінструктаваць гэтых кіраўнікоў. Забясьпечыць падбор кандыдатур у склад дэлегацкіх сходаў, арганізаваўшы шырокае абгаварэньне вылучаных кандыдатур на нарадах актыву прадпрыемстваў, калгасаў, груп беднаты.

Посьпех правядзеньня перавыбарчай кампаніі ў значнай ступені залежыць ад таго, наколькі ў ёй прымуць актыўны ўдзел усе грамадзкія, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя ўстановы і арганізацыі. Для прыкладу возьмем такое мерапрыемства, як арганізацыя работы дзіцячых устаноў у такім напрамку, каб даць магчымасьць масам працоўных жанчын удзельнічаць на перавыбарчых сходах. Органы Наркамасьветы. Аховы Здароўя, Каансаюзу і Калгасцэнтру—у гэтай справе павінны праявіць найбольшую актыўнасьць і арганізаваць абслугоўваньне дзіцячых устаноў з тым, каб даць максымальную магчымасьць працоўным жанчынам удзельнічаць у перавыбарах сходаў.

Посьпех правядзеньня перавыбараў дэлегацкіх сходаў—будзе залежаць ад таго, наколькі будзе забясьпечана цьвёрдае партыйнае кіраўніцтва і наколькі ў ходзе работы будуць выкананы дырэктывы ЦК КП(б)Б. **Трэба прыняць усе меры да таго, каб перавыбарчая кампанія стварыла сапраўдны і рашучы пералом у рабоце сярод працоўных жанчын. Работу сярод жанчын партыйныя, савецкія і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі павінны лічыць сваёй непасрэднай і арганічнай справай, штодзенна працаваць на гэтым адказным вучастку. Вось асноўная і першачарговая задача перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў.**

Міх. Лабэдзеў.

ДА ЗЯЛЕНАЯ СЯЎБА

РУХ МАС

Калгасы „Паростак сацыялізму", „Рухавік", імя Чангарскай дывізіі, імя Энгельса і інш. пашырылі азімы клін на 100-200 проц. Посьпехі ўдарнікаў сяўбы выклікаюць прыліў у калгасы. Новы к ас імя Будзёнага першым ва Ўраравіцкім раёне прыступіў да калектыўнай сяўбы. Па-бальшавіцку арганізаваць і стаць на чале новага калгаснага прыліву.

2.900 гаспадарак уступіла ў калгасы БССР за апошнюю дэкаду

Ганебна слаба ідзе кантрактацыя азімых і ачыстка насеньня. У калгасах няма малатарань, сартовак, сявярак, а каапэрацыя ня можа разьмеркаваць тысячы машын. Палі патрабуюць вапны, вапна псуецца пад дажджом. Даволі агіднай сьпячкі. Усякая маруднасьць і расхлябанасьць у правядзеньні сяўбы—дапамога кулаку. Вышэй тэмпы сяўбы, мацней удар па кулацтву.

Ударнікі сяўбы

Перадавыя калгасы і адзінаасобнікі пашыраюць пасеўную плошчу

ГОМЕЛЬ, 4. (Брыгада **«Зьвязды»**). Асобныя калгасы паказваюць узор бальшавіцкай падрыхтоўкі да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Калгасы—імя **Чарвякова** і **«Паростак сацыялізму»**, Рэчыцкага раёну параўнальна з мінулым годам пашыраюць свой азімы клін у тры разы. Калгасы **«Трактарысты»**, **«Гром»**, **«Савецкая Беларусь»**, Буда-Кашалёўскага раёну павялічылі пасеўную плошчу ў два разы, калгасы **«Рухавік»**, **«Взкер»**, імя Энгельса і імя **Чангарскай дывізіі**, Уваравіцкага раёну пашыраюць азімы клін у 2-3 разы і г. д.

Па прыкладу перадавых калгасаў у некаторых мясцох **адзінаасобнікі ўключаюцца ў барацьбу за пашырэньне азімага кліну.** Адзінаасобнікі Артуноўскага, Гавеніцкага і Азэршчынскага сельсаветаў, Рэчыцкага раёну павялічваюць свой азімы клін на 25 проц. за лік раскарчоўкі і мэліярацыі балот. У гэтым-жа раёне в. в. Чырвоны Востраў і Каравацішчы пашырылі пасеўную плошчу на **180** гэкт. Адзінаасобнікі Змычкоўскага сельсавету, Уваравіцкага раёну павялічылі азімы клін на **25** проц.

У сувязі з баявой падрыхтоўкай асобных калгасаў да асеньняй сяўбы, у некаторых мясцох заўважаецца **новы калгасны прыліў.** У калгасы **«Перамога»** і імя **Чарвякова** (Рэчыцкі раён) уступіла каля **20** бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У гэтым-жа раёне пядаўна арганізаваліся **4** новыя вытворчыя аб'яднаньні. У калгасы **«Палеская Праўда»** і **«Взкер»** (Уваравіцкі раён) уступіла **9** серадняцкіх гаспадарак.

У в. **Крыўск**, Уваравіцкага раёну пядаўна арганізаваўся калгас імя Будзёнага на плошчы ў 226 га. **Новы калгас першым у раёне прыступіў да асеньняй сяўбы.**

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎ

Вывозяць гной на по.

Зьмен амаль няма

Ачыстка збожжа і кантрактацыя зрываюцца

Карэнны зрух павінен быць

НКЗ БССР да сёнешняга дня не атрымаў вестак ад усіх раёнаў аб ходзе асеньняй пасеўнай кампаніі. Зводка НКЗ Беларусі на 30-е жніўня складзена на аснове вестак, атрыманых толькі ад 85 раёнаў. Аб чым гаворыць зводка?

Плян ачысткі збожжа выканан усяго на 5,5 проц. Калгасы на 30-е жніўня выканалі плян ачысткі на 10 проц. і індывідуальны сэктар—на 7. Пратручваньне азімай пшаніцы паказвае зусім мізэрную лічбу ў 0,11 проц.

Абмен насеньня за дэкаду пасунуўся з 4,3 проц. да 12,6. Зрух зусім слабы. Кантрактацыя азімых стаіць на адным пункце. На 3-е жніўня плян выканан толькі на 3,7 проц. Прычым на індывідуальны сэктар прыходзіцца яшчэ менш—1,7 проц.

Лічбы аб рэалізацыі машын паказваюць, што папяводная і каапэрацыйная сыстэма ДРЭННА арганізавала разьмеркаваньне машын. Складаныя машыны зусім слаба разыходзяцца сярод калгасаў. На 30-е жніўня ў астачы было 2.449 сявярак, 1.199 сартыровак і 818 трыераў. Недапушчальны факт.

Калі на 20-е жніўня плян сіласаваньня па БССР быў выканан толькі на 1,1 проц., дык на 30-е плян выканан усяго на 1,34 проц. Нават да 2 проц. не дацягнулі. ГАНЬБА.

2.900

ПОСЬПЕХІ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ ВЫКЛІКАЮЦЬ НОВЫ МАСАВЫ ПРЫЦЭК У КАЛЕКТЫВЫ. РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ЎРАДЖАЮ ПА КОЛЬКАСЬЦІ І ЯКАСЬЦІ ПРАЦЫ, ДОБРАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРЫ ЎРАДЖАЮ І БАЯВАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ Ў ШМАТ ЯКІХ КАЛГАСАХ РОБЯЦЬ ВЯЛІКАЕ ЎРАЖАНЬНЕ НА АДЗІНААСОБНІКАЎ. З МЕСЯЦ ПАСТУПАЮЦЬ УСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ ВЕСТКІ АБ ПРЫЛІВЕ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС У КАЛГАСЫ. ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ ЖНІЎНЯ (ПАВОДЛЕ ВЕСТАК НА 30-Е ЖНІЎНЯ Г. Г.) У КАМУНЫ І КАЛГАСЫ БЕЛАРУСІ ЎСТУПІЛА 2.900 НОВЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

ТЭЛЕГРАМА НКЗ БССР УСІМ РВК

Неадкладна арганізуйце праверку спраўнасьці і загрузкі трактараў. Дамажэцеся скарачэньня прастояў трактараў у рамонце. Забясьпечце 20 гадзін работы трактару ў суткі. Тэлеграфуйце 6 верасьня аб колькасьці трактараў у рамонце. Прымеце меры да ўзмацненьня абмалоту, ачысткі і абмену насеньня. Арганізуйце копку бульбы раней зьвычайнага тэрміну. Дамажэцеся ўборкі ільну ў калгасах і саўгасах. Прыцягнеце да адказнасьці тых, хто не прадставіў пасеўных зводак.

МАСЮКОЎ.

СЯЎБА ЗАХАПІЛА ЗЬНЯНАЦКУ

БАБРУЙСК, 4. (Наш. кар.). У паасобных вёсках Бабруйскага раёну ПАЧАЛАСЯ СЯЎБА АЗІМЫХ. Сяўба захапіла раённыя арганізацыі зьнянацку. Райком партыі, райвыканком і райпаляводсаюз зусім НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ да асеньняй пасеўнай кампаніі. Плян асеньняй сяўбы даведзены толькі да сельсаветаў. Ні адзін калгас, ні адна вёска не абмяркоўвалі гэтага плану. Варта адзначыць, што і да сельсаветаў плян пасеўнай кампаніі даведзены толькі фармальна. Багушэўскі, Бартнікоўскі і інш. сельсаветы нават не абмяркоўвалі пытаньня аб асеньняй сяўбе.

Райвыканком нічога ня ведае аб ходзе падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Зьмяняпарадкаваньне ў раёне далёка ня скончана. У шмат якіх сельсаветах да гэтага часу не адведзены азімы клін. Вапнаваньне зрываецца. Кантрактацыя азімых пасеваў таксама праводзіцца надзвычай дрэнна.

Калгасы «КОЛАС», «ПРАГРЭС», ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН» і інш. яшчэ ня скончылі ўборкі ўраджаю. У Бабруйскім раёне калгасы да сяўбы зусім не падрыхтаваны. Раённыя арганізацыі змазалі палітычную сутнасьць асеньняй сяўбы. Ніхто ў раёне нічога ня робіць па арганізацыі новага прыліву ў калгасы, забываючы, што асеньняя сяўба павінна даць прыцёк заяў у калектывы

НЕБЯСЬПЕКА НЕ ЛІКВІДАВАНА

Машыны іржавеюць, угнаеньне псуецца

АБМАЛОТ ІДЗЕ МАРУДНА

ГОМЕЛЬ, 4. (Брыгада «Зьвязды»). У паўночных раёнах Гомельшчыны—**Хойніцкім, Брагінскім, Рэчыцкім** і частова ва **Ўраравіцкім пачалася асеньняя сяўба.**

Ня гледзячы на вялікія посьпехі паасобных калгасаў у падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы, пагроза зрыву пасеўнай кампаніі па Гомельшчыне **не ліквідавана.** Па-ранейшаму шмат якія партыйныя камітэты, РВК і калгасназемельныя органы зусім ня рыхтуюцца да асеньняй сяўбы. У Брагінскім і Хойніцкім раёнах да гэтага часу некаторыя калгасы і адзінаасобныя бядняцка - серадняцкія гаспадарки ня ведаюць, дзе яны будуць сеяць. Ва Ўраравіцкім раёне ачыстка насеньня не разгорнута. У калгасах не хапае трыераў, сэтэ-ровак, малатарань, угнаеньня і т. д. Між тым, на ст. Уза пад дажджом стаяць **6 сартыровак, 3 трыеры, 3 сявяркі, 9 малатарань, 20 веялак, 18 тон супэрфасфату і 50 вагонаў вапны.** Такое злачынае галавацяпства мяжуе з простым шкодніцтвам.

Варта адзначыць зусім слабы ход кантрактацыі на Гомельшчыне. Процант закантрактаванай плошчы пасеваў ледзь дасягае 6. Шмат якія раёны ня робяць нічога ні на арганізацыі пасеўных фондаў. У **Брагінскім, Чачэрскім і Хойніцкім** раёнах калгасы да сёнешняга дня не прыступілі да засыпкі пасеўфондаў.

Абмалот ідзе **дрэнна.** Насеньне, патрэбнае для засеву палёў калгасаў і адзінаасобнікаў, яшчэ **не абмалочана.**

1.000 галоў жывёлы--пад пагрозай пагібелі

Агіднейшае галавацяпства гомельскага ЦРК і Райкалгасбуду

ГОМЕЛЬ (па тэлефону ад нашага брыгадзіра)

1.000 галоў жывёлы ў прыгараднай фэрме Гомельскага ЦРК знаходзіцца чырвона - нямецкай пароды, 92 г. колаб і 24 вытворцы, якія маюць замежныя дыплёмы.

Увесь мападняк павінен быў знаходзіцца ў калгасе, але гомельскі райкалгасбуд адмовіўся яго прыняць.

У сувязі з дрэнным надвор'ем і дажджлівай і халоднай раніцай становішча жывёлы пагражаючае. Увесь гурт знаходзіцца ў вельмі дрэнных умовах. Горшага нельга прыдумаць.

Прыбыла жывёла з Украіны ў колькасьці 485 галоў. Першы гурт даваў 6,7 літраў малака ў дзень, а зараз толькі 3 з палов. літры. Пры такіх агідных умовах удой увесь час будзе яшчэ больш памяншацца.

Санітарны нагляд зусім адсутнічае. Увесь гурт паступова будзе гінуць. Гэта падцьвярджаецца тым, што ўжо зараз хварэе больш 40 галоў жывёлы. Гурт нічым не падкармліваецца.

**ГАЛОЎНЫМ ВІНАВАТЫМ у такім становішчы зьяўляецца ў першую чаргу ГОМЕЛЬСКІ КАЛГАСБУД, які не пабудаваў у час кароўніка. Райкалгасбуд павінен быў скончыць будаўніцтва трох кароўнікаў да 15 жніўня, малочную на 1.000 галоў жывёлы—да 10-га верасьня і сьвірань збожжасхоў—да 15-га верасьня. Сапраўды-ж будаўніцтва выканана ня больш, як на

Рыхтуйцеся да 1 кастрычніка---Усесаюзнага дня ўдарніка

Сустрэчным прамфінплянам--ПА ВОРАГАХ бальшавіцкіх тэмпаў

Ліквідацыяй прарываў падрыхтуем моцную базу для перавыкананьня плянаў трэцяга году пяцігодкі

400 прапаноў рабочых Бабруйскага камбінату---

ЛЕПШАЯ ГАРАНТЫЯ ВЫКАНАНЬНЯ „СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ"

Абгаварэньне кантрольных лічбаў прамфінпляну на 1930-31 г. па Бабруйскім камбінаце праходзіць пад знакам падагульваньня работы за 1929-30 г. і выпрацоўкі «сустрэчнага прамфінпляну», які забясьпечвае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Вакол гэтай важнейшай палітычнай кампаніі праведзена вялізарная растлумачальная работа. Работа праводзіцца па-баявому (праз насьценгазэты, пёзунгі, плякаты і г. д.). 5 ЧАСОВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ КАМІСІЙ, выпучаных па цэхах, займаюцца дэталёвай распрацоўкай кантрольных лічбаў і выпрацоўкай асноў «сустрэчнага», 152 РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ, у якіх працуюць 809 ЧАЛАВЕК (на першым месцы стаіць фанэрны цэх, які арганізаваў 107 брыгад, аб'яднаючых 450 рабочых), займаюцца дэталёвым вывучэньнем работы кожнага варштату пасобку і усіх недахопаў, вызначаюць шляхі далейшага паляпшэньня працы. 1.500 РАБОЧЫХ прынялі ўдзел у распрацоўцы кантрольных лічбаў на агульных сходах, вытворчых нарадах і г. д.

Рабочыя далі дагэтуль каля 400 ПРАПАНОЎ, накіраваных на далейшае разгортваньне вытворчасьці. Шмат прапаноў зьяўляецца вельмі каштоўнымі. Вось прыклады.

У фанэрным цэху ўнесены прапановы аб павялічэньні зваротаў варштатаў з 30 да 40, прыстасаваньні двухпільнай цыркуляркі на 4-хпільную. Унесеныя па песасцэху прапановы (арганізацыя транспацёра для перавозкі дошак, аўтаматычная точка піл і г. д.) могуць даць звыш 22 тысяч рублёў эканоміі.

Асаблівую актыўнасьць праяўляюць «СКВАЗНЫЯ БРЫГАДЫ», якімі ўнесена 50 ПРОЦ. УСІХ ПРАПАНОЎ.

Зараз ідзе канкрэтная распрацоўка рабочых прапаноў. Над гэтым працуе спэцыяльная тройка. Для прэміяваньня лепшых прапаноў вылучаны фонд у 3.000 рублёў. ПА ЦЭХАХ камбінату арганізаваны РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІЯ БЮРО. Яны распаўсюджваюць цяпер сярод рабочых 2.000 анкет, з мэтай збору прапаноў рабочых аб барацьбе са стратамі, правядзеньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і г. д.

Сваю дьвёрдую рашучасьць выканаць пяцігодку за чатыры гады рабочыя камбінату бліскуча даводзяць у сваіх «сустрэчных прамфінплянах», ужо распрацаваных па цэхах.

«Сустрэчны плян» песасцэху прадугледжвае выпрацоўку 45 КУБАМЭТРАЎ У РАМАЗЬМЕНУ СУПРОЦЬ 42-х ПАВОДЛЕ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ. Рабочыя фанцэху вызначылі выпрацаваць у дзень 112 КУБАМЭТРАЎ СУПРОЦЬ 105 ПАВОДЛЕ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ. Прамфінплян прадугледжвае выпрацоўку беларэўным цэхам 1 мільёну кубамэтраў, але «сустрэчны» вызначае выпрацоўку 1.100 ТЫСЯЧ КУБАМЭТРАЎ.

Побач з гэтым трэба адзначыць слабую раскачку электрастанцыі, біржы піламатар'ялаў і мэханічнай майстэрні, дзе гэта работа толькі пачалася.

Лепшы цэх па прапрацоўцы кантрольных лічбаў і складаньні «сустрэчнага» атрымае прэмію—АБСТАЛЯВАНЬНЕ ЧЫРВОНАГА КУТКА.

А. МАГІДАЎ.

Не здаваць заваяваных пазыцый

На гуце „Камінтэрн" рабочыя прапановы не ў пашане

Гута «Камінтэрн» — адно з трох прыкладных прадпрыемстваў, высунутых па Беларусі для ўдзелу ў спаборніцтве за сьцяг УсеЦСПС. І, трэба адзначыць, што месяцёньні заводу сапраўды значныя. За тры кварталы прамфінпляну з адносінах колькасьці выпушчанай прадукцыі выкананы на 129,2 проц. Прадукцыйнасьць працы павялічана на 16 проц., сабекошт зьніжаны на 8,8 процантаў. Брак і бой замест 6 проц. паводле пляну, дасягаюць 4,6 проц.

Тым больш ганебным зьяўляецца паслабленьне за апошні час партыйнага і прафэсіянальнага кіраўніцтва вялікім уздымам актыўнасьці рабочых. У работе партыйных і прафарганізацый заводу адчуваюцца яшчэ «адпускныя» настроі, у выніку чаго назіраецца некаторы самацёк. Даволі паказаць на тое, што да 17 жніўня ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых аб уключэньні заводу ў спаборніцтва за сьцяг УсеЦСПС ня было і, нават пасьля правядзеньня гэтай растлумачальнай кампаніі, знайшліся члены заўкому, якія ня ведалі сутнасьці спаборніцтва.

На заводзе нічога ня чуваць пра сквазныя брыгады і пра сустрэчны прамфінплян. Ня гледзячы на тое, што засталося менш месяца да новага гаспадарчага году, адміністрацыя яшчэ не прадставіла свайго праекту кантрольных лічбаў на 1930-31 год.

Невыстарчальна разгорнута на заводзе рацыяналізатарская работа. Характэрна, што з красавіка 1929 г. па чэрвень 1930 г. была толькі 21 прапанова рабочых па рацыянадізацыі вытворчасьці, прычым з іх ажыцьцёўлена толькі 11 прапаноў, 3 прапановы зусім ня выканаці, адна — аказалася нерэальнай, а што чуваць а рэштай прапаноў, — пакуль што невядома. Ня гледзячы на нядаўні рамонт, не ўрэгулявана пытаньне аб стоку вады на заводзе. У выніку гэтага — толькі за апошнія тыдні былі 2 выпадкі прастою печак «кукушак» а прычыны таго, што вада трапіла ў суседства з газавым каналам (гэта акалічнасьць пагражае выбухам, калі вада трапіць у самы канал).

Завод мог-бы яшчэ паленьшыць сваю прадукцыю пры наяўнасьці хаця-б невялічкай лябараторыі, але Шклоаб'яднаньне шкадуе сродкаў і з-за гэтага «тэхнічны» брак яшчэ мае месца ў заводзкай прадукцыі, асабліва за апошні час, калі ў якасьці сырцу Шклоаб'яднаньне пачало прысылаць танарды.

Трэба адзначыць, што Шклоаб'яднаньне адносіцца да заводу «Камінтэрн» абыяк. Гэта ярка выявілася ў пытаньнях водпуску сродкаў на жылбудаўніцтва. Для «Камінтэрну» было вызначана згодна пляну на жылбудаўніцтва 20.000 руб., але-ж па нейкіх прычынах Шклоаб'яднаньне выдала толькі 13.000 рублёў. Рэшта «вісіць у паветры». У выніку пачатае ўжо ў гэтым годзе жылбудаўніцтва стаіць перад зрывам. Між тым, завод «Камінтэрн» перажывае вельмі вострыя жыльлёвы крызіс (на заводзе ёсьць кватэры, дзе ў адным маленькім пакойчыку жывуць 4 сем'і рабочых з 12-ці душ). Жыльлёвы крызіс таксама выклікае цягучасьць рабочае сілы, асабліва кваліфікаванай.

Мы напярэдадні новага гаспадарчага году. Завод «Камінтэрн» ня можа спыняцца на дасягнутых посьпехах. Партколектыў і прафарганізацыі заводу павінны зараз-жа па-бальшавіцку мабілізаваць усю рабочую масу. Ад добрай падрыхтоўкі «сустрэчнага прамфінпляну», разгорнутай кампаніі барацьбы са стратамі, далейшага пашырэньня ўдарніцтва — залежыць, наколькі ўзброеным завод падыйдзе да новых перамог у трэцім годзе пяцігодкі. Адначасова мы павінны з усёй рашучасьцю патрабаваць зьмены адносін Шклоаб'яднаньня да перадавога заводу. Ні ў якім разе нельга дапускаць далейшага затрыманьня сродкаў на жылбудаўніцтва, плян якога павінен быць поўнасьцю выкананы.

АЛЬФА.

Дырэктар струсіў, заўком спалохаўся

АПАРТУНІСТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА НА ГУЦЕ „КАСТРЫЧНІК"

НОВЫ ПРАМФІНПЛЯН СУСТРЭЎ АГІДНЫЯ АДНОСІНЫ З БОКУ ДЫРЭКЦЫІ І ЗАЎКОМУ. ПРЫ РАСПРАДОЎЦЫ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ДЫРЭКЦЫЯ ПАНІЗІЛА ВЫРАБ ШКЛА СУПРОЦЬ МІНУЛАГА ГОДУ НА 30 ТОН.

— ВЫХОДЗЯЧЫ З АДСУТНАСЬЦІ КВАЛІФІКАВАНАЙ СІЛЫ І ЛЕТАШНІХ ЛІЧБАЎ, НОВАГА ПРАМФІНПЛЯНУ ВЫКАНАЦЬ НЕЛЬГА, — ТАК ЗАЯВІЛА АДМІНІСТРАЦЫЯ. ЗАЎКОМ ДАМАГАЎСЯ ЯШЧЭ БОЛЬШАГА ЗЬМЯНШЭНЬНЯ.

КАЛІ БЮРО ПАРТЯЧЭЙКІ АСУДЗІЛА НЕДАПУШЧАЛЬНАСЬЦЬ ПАВОДЗІН ДЫРЭКЦЫІ І ЗАЎКОМУ, ДЫРЭКЦЫЯ, ЗАМЕСТ ВЫСУНУТЫХ ЛІЧБАЎ З ПАНІЖЭНЬНЕМ НА 30 ТОН СУПРОЦЬ МІНУЛАГА ГОДУ, РАПТАМ ПАВЫСІЛА ІХ НА 407 ТОН, ДЭЗАРЫЕНТУЮЧЫ АРГАНІЗАЦЫІ І РАБОЧЫХ.

БЮРО РАЙКОМУ Ў ПАВОДЗІНАХ АДМІНІСТРАЦЫІ І ЗАЎКОМУ ПРЫЗНАЛА ПРАВЫ ЎХІЛ НА ПРАКТЫЦЫ, АББЯСЬЦІЛА ВЫМОВУ ДЫРЭКТАРУ І ЗАПРАПАНАВАЛА ЦП САЮЗУ ПРАВЕСЬЦІ ДАТЭРМІНОВЫЯ ПЕРАВЫБАРЫ ЗАЎКОМУ. ЗАЎКОМ РАСПУСЦІЧАНЫ.

Т—кі.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» заклікае рабочых «Кастрычніка» арганізацыяй «сустрэчнага прамфінпляну» і выкананьнем прамфінпляну бягучага году моцна ўдарыць па правых апартуністых. Просім рабкораў гуты сыстэматычна пісаць аб далейшым змаганьні рабочых за «сустрэчны прамфінплян».

Сотні тысяч рублёў на вецер

Дзякуючы актыўнай дапамозе рабочых брыгадзе ЦСПСБ, апошняй удалося выявіць на фабрыках «Дзьвіна», абутковай імя Лекерта і на заводзе «Чырвоны Мэталісты» (Віцебск) шмат недахопаў і страт, якія тармозяць выкананьне прамфінпляну.

На ўсіх прадпрыемствах рацыяналізатарская работа знаходзіцца ў дрэнным становішчы.

На абутковай фабрыцы бюро рацыяналізацыі няма, рацыяналізатар (работы-вылучэнец) з-за адсутнасьці кіраўніцтва з боку ІТР, працуе нездавольнічча, плян рацыяналізацыі на 1929-30 год ня быў складзены.

На заводзе «Чырвоны Мэталісты» бюро рацыяналізацыі працуе бясплянава. Цэхавыя рацыяналізатарскія ячэйкі да гэтага часу не арганізаваны. З пачатку другога паўгодзьдзя рацыяналізатарская работа зусім не праводзіцца. Крыху лепш справа на фабрыцы «Дзьвіна», але і тут работа праводзілася толькі да 15-га чэрвеня, а з таго часу сьпіць. Пастанова ВСНГ і УсеЦСПС аб вылучэньні інжынэра, або тэхніка ў якасьці рацыяналізатара ня выканана.

Як агульнае зьявішча трэба адзначыць — дрэнны ўлік рабочых прапаноў і ня меш дрэнны кантроль над іх выкананьнем.

На фабрыцы «Дзьвіна» з 128 рабочых прапаноў выкананы толькі 54. На абутковай фабрыцы амаль што ўсе прапановы ня выкананы. На заводзе «Чырвоны Мэталісты» дрэнне становішча ўліку не дае магчымасьці бачыць сапраўдны малюнак руху рабочых прапаноў.

Брыгада ЦСПСБ выявіла шмат страт. На абутковай фабрыцы запас загатовак складае 35.000 пар супроць патрэбнага двухдзённага запасу ў 8.000 пар. На сёнешні дзень стаяць 15 машын, у тым ліку 3 імпартныя, якія пасьля дробнага рамонту можна пусьціць у ход. На складзе ляжыць больш 5.000 заднікаў, якія не скарыстоўваюцца на працягу цэлага году. У сьмецьці была знойдзена звыш 2 тон мядзянага дроту, коштам больш за 1.000 руб. Імпартная машына была расьцягана па частках, застаўся толькі адзін корпус.

На фабрыцы «Дзьвіна» ў ватарным і ў іншых цэхах стаіць нярухома 16 машын. На складзе знойдзена 16.500 штук бракаваных гумавых ватарных валікаў, якія каштуюць фабрыцы больш за 16.000 руб.

Вельмі часта здараюцца выбухі кардмашын і адміністрацыя нічога ня робіць, каб гэта папярэдзіць. Апошні выбух новай нямецкай кард-машыны № 11 будзе каштаваць фабрыцы больш за 1.500 руб.

На заводзе «Чырвоны Мэталісты» таксама ёсьць вялікія страты. Газэта «Мэтпромавец» ужо сыгналізавала аб тым, што махавікі да малатарань і малыя цыліндрычныя шасьцёрні да прывадоў адліты, але яшчэ не расточаны. Прывады «СМП2» у колькасьці 12 штук ня скончаны. 1.000 барабанных і 400 талесрачных шасьцёрань, зробленыя паводле заказу, не адгружаны. Часткі да прывадоў «Майфарта» марнуюцца і г. д.

Брыгада ЦСПСБ прапанавала заводзкім арганізацыям зьнішчыць выяўленыя недахопы. Завадзкія арганізацыі павінны прасачыць, каб прапановы брыгады і рабочых былі выкананы.

Шаткін, Брайлін.

7-га верасьня а 7 гадз веч. у залі пасяджэньня
Фрунзаўскі РК КП(б)Б
скліча
ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ РАЕННАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б
Парадок дня:
1. Вынікі ўдзелу партарганізацый ва ўборачнай кампаніі і задачы правядзеньня асеньняй пасяўнай кампаніі.
2. Пытаньні канфэрэнцыі.
Явка членаў і кандыдатаў РК, сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б, старшынь выканбюро і сакратароў ячэек на пэфству над вёскай абавязкова.
Запрашаюцца члены райпартпройкі і рэвізійнай камісіі.
Фрунзаўскі РК КП(б)Б

Рабочыя заводу „Адраджэньне", вы зрываеце сваячасовы пуск Магвалакнабуду

Вам трэба: выявіць прычыны невыкананьня заказаў і моцна ўдарыць па вінаватых

Гэрачнымі намаганьнямі рабочых і тэхнэрсаналу Магвалакнабуд ва ўдарным парадку рыхтуецца да пуску раней вызначага тэрміну. Усе заводы, што вырабляюць абсталяваньне Магвалакнабуду, улічылі, што пры такіх умовах сарваць энтузіязм мас было-б злачынна і ўсяк фарсуюць выкананьне іншых заказаў.

Супроць нашых чаканьняў, мясцовы завод «Чырвоны Адраджэнец», які заняў нас у сваячасовым выкананьні нашых заказаў, прычым тэрміны даныя заводам, былі ўвязаны з усімі мантажнымі плянамі, 23 жніўня заявіў нам, што прынятыя ім на сябе абавязкі па выкананьні нашых заказаў ня будуць выкананы ў тэрмін.



Швэдзкі турбагенэратар на 10 тыс. клв. на Асінбудзе

Так напрыклад, завод павінен быў здаць у ліпені: 2 цыркулярныя бакі, расчыніцель для глюкозы, 3 іншыя бакі, дэкантацыйны цыліндар, цыркуляцыйны бак для серкавага патру, 2 карыты для адбельнай машыны, 5 мернікаў; у жніўні: 2 бакі, дэкантацыйны цыліндар, варку для серкавага патру, 9 мернікаў і інш.

Здана заводам: 1 расчыніцель для глюкозы і адно карыта для адбельнай машыны. Рэшта заказаў была перанесена, з нашае згоды, на жнівень. Выявілася, што ў жніўні яны нічога не здаюць, ня гледзячы на тое, што ў пачатку жніўня да выкананьня заказу было прыступлена і, пры жаданьні, апошні мог быць выкананы ў тэрмін.

23/VIII нам было заяўлена, што і жнівеньскія заказы разам з ліпеньскімі пераносяцца на сярэдзіну і канец верасьня, пры ўмове дачы заводу дазволу на 3.000 звышнармовых гадзін.

Яшчэ больш востра стаіць пытаньне з выкананьнем заказу па трансмісіі. Згодна дагаворанасьці, заказ павінен быў быць выкананы да 1-га верасьня. Між тым, на сёньня гатовы толькі некалькі шківаў, валы завод абяцае даць да 15 верасьня, у адносінах-жа рэшты заказу (шківы, падшыпнікі, падвескі і г. д.), наогул адмаўляецца даць якія-б там ні было гарантаваныя тэрміны.

Трэба падкрэсьліць, што ў працягу апошняга месяцу завод амаль зусім не аддаваў увагі гэтаму заказу, ня зроблены нават мадэлі па чарцяжох, даўно пераданых заводу.

Створанае становішча з нашымі заказамі на заводзе «Чырвоны Адраджэнец» сыгналізуе аб небясьпецы зрыву пуску фабрыкі ў тэрмін.

Патрэбна мабілізацыя ўсіх партыйных і грамадзкіх арганізацый заводу для адхіленьня створанага прарыву. Партыйная арганізацыя заводу, рабочыя павінны задумацца над гэтым пытаньнем, заказ павінен быць выкананы ў тэрмін. Магвалакнабуд павінен быць пушчаны раней тэрміну.

АСТАПАЎ.

ЗА КЛЯСАВАЕ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ТАВАРАЎ

У БССР арганізуюцца 24 закрытыя разьмеркавальнікі

Рабочыя ўхваляюць новы мэтад разьмеркаваньня тавараў

НА АБГАВАРЭНЬНЕ РАБОЧЫХ МАС

Гэтымі днямі ў Маскве пры Цэнтрасаюзе скончылася нарада па пытаньні арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў.

Грунтуючыся на пастанорах усесаюзнай нарады, праўленьне Белкаапсаюзу ўхваліла спэцыяльную пастанову аб арганізацыі разьмеркавальнікаў.

Паводле пастановы Белкаапсаюзу, закрытыя разьмеркавальнікі стварацца ў першую чаргу пры буйных прадпрыемствах. Дапускаецца арганізацыя разьмеркавальнікаў таксама ў раёнах — па ЖАКТах і ў рабочых пасёлках.

Пакуль што канкрэтна вызначана стварыць у Менску 8 разьмеркавальнікаў, у Гомелі — 6, у Віцебску — 6 і ў Барысаве — 4. Да 15-га верасьня ў якасьці пробы арганізуюцца разьмеркавальнікі ў Менску, Віцебску і Гомелі — па два і ў Барысаве — 1.

У першую чаргу будуць арганізаваны закрытыя прадуктовыя разьмеркавальнікі на «Бальшавіку», «Энэргіі», майстэрні ВСНГБ «Полымя рэвалюцыі» і на гуце «Пралетары». На працяту месяца — да 15 кастрычніка — рэшта разьмеркавальнікаў.

Арганізацыйна - масаваму сэктару каапсаюзу даручана ў 2-тыднёвы тэрмін распрацаваць канкрэтны плян далейшага разгортваньня сеткі, з тым, каб да 1 студзеня 1931 году закрытыя разьмеркавальнікі былі ва ўсіх гарадох (пры ўсіх больш-менш буйных прадпрыемствах).

У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня рабочага кантролю над закрытымі разьмеркавальнікамі, папершае, загатчыкі іх павінны быць абавязкова абраны на агульным сходзе спажыўцоў-рабочых. Падругое — усе прадпрыемствы павінны ўзяць шэфства над сваімі разьмеркавальнікамі.

ЦРК запрапанавана вызначыць для закрытых разьмеркавальнікаў лепшыя магазыны, каб як мага паўней абслугоўвіць рабочых. Асабліву ўвагу зварачае праўленьне Белкаапсаюзу на пастаноўку работы ў саміх разьмеркавальніках. Яна павінна набыць ударныя тэмпы; трэба арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж работнікамі разьмеркавальнікаў на лепшае абслугоўваньне рабочых.

На пытаньні грамадзкага харчаваньня праўленьне Белкаапсаюзу вырашыла, што да кожнага прадпрыемства павінна быць прымацавана пэўная сталовая.

Агульная ўстаноўка: закрытыя разьмеркавальнікі маюць у сабе толькі прадукты. Асобна на прамысловых прадпрыемствах стварацца з цягам часу раённыя разьмеркавальнікі. Гэта робіцца ў мэтах прадастаўленьня магчымасьці больш дакладнага выбару рабочымі тых або іншых тавараў (абутку, адзеньня і г. д.).

Праўленьне Белкаапсаюзу зьвярнулася ўчора са спэцыяльным лістом да ўсіх ЦРК і прафбюро. У лісьце яно прапануе, кіруючыся палажэньнем аб закрытых разьмеркавальніках і пастановай Белкаапсаюзу, узгадніць плян арганізацыі іх з прафсаюзамі, шырока абмеркаваць яго на рабочых сходах і эканомнарадах і безадкладна, пры дапамозе рабочай грамадзкасьці, прыступіць да ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства ў вызначаны тэрмін.

Зусім зразумела, што ўвядзеньне новага мерапрыемства ні ў якім разе не павінна пагоршыць абслугоўваньне тых рабочых, якія ня будуць у першыя часы ахоплены разьмеркавальнікамі.

Зараз павінны сказаць сваё слова наконт дэталяй пастаноўкі гэтае справы найшырэйшыя масы рабочых. Ад прапаноў саміх рабочых, ад шырокага ўдзелу іх у гэтай важнейшай рабоце залежыць посьпех арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў.

Юр.

ГОЛАС РАБОЧЫХ

Рэдакцыя зьвярнулася з запытаньнем да рабочых—членаў каапэрацыйных камісій буйнейшых прадпрыемстваў Менску з просьбай выказаць сваю думку адносна арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў. Вось што адказалі рабочыя.

Т. т. Ліпкер —старшыня каапэрацыйнай камісіі заводу «Бальшавік» лічыць, што закрытыя разьмеркавальнікі павінны быць арганізаваны пры ўсіх буйных прадпрыемствах, дзе лепш будзе арганізаваць рабочы кантроль. Рабочыя пасьля работы змогуць атрымліваць патрэбныя ім тавары. Пажадана, каб разьмеркавальнікі адпускалі ня толькі харчовыя прадукты, але і наогул тавары шырокага ўжытку.

Член каапэрацыйнай камісіі заводу «Бальшавік» рабочы т. Капляровіч лічыць, што разьмеркавальнікі павінны быць арганізаваны таксама і ў рабочых пасёлках, якія знаходзяцца далёка ад гораду. Наогул такая форма разьмеркаваньня тавараў цяпер зьяўляецца найбольш мэтазгоднай, бо яна гарантуе рабочым атрыманьне вызначаных для іх тавараў па адпаведных нормах.

Упоўнаважаны і старшыня каапэрацыйнай камісіі пічотачнай фабрыкі імя Крупскай т. т. Запатароў і Шуцін адзначылі, што гэта мерапрыемства падтрымліваюць усе рабочыя іх фабрыкі. Праз закрытыя разьмеркавальнікі трэба будзе адпускаць рабочым у першую чаргу харчовыя прадукты, а паступова і ўсе іншыя тавары. Каб лепш ажыцьцяўляць кантроль над разьмеркавальнікамі, трэба будзе арганізаваць спэцыяльныя рабочыя тройкі, выбраныя прадпрыемствамі.

Адказ на тры асноўныя пытаньні

Ікмнуліся мы атрымаць ад прафсаюзных работнікаў Менску: па якім прынцыпе лепш будаваць закрытыя разьмеркавацелі тавараў (вытворчым ці тэрытарыяльным), якімі таварамі забясьпечваць іх і як ажыцьцявіць на практыцы рабочы кантроль над водпускам саміх тавараў.

Вось што паведамілі наконт гэтага некаторыя адказныя работнікі ЦСПСБ.

Загадчык сацыяльна бытавога сэктару ЦСПСБ — т. Беленьні. У зьвязку з гэтым, надзвычай важным пытаньнем, высунутым «Правдой» яшчэ 27.жніўня на 4-х буйнейшых прадпрыемствах, былі праведзены пятучыя сходы. Увечары таго-ж дня адбылася шырокая нарада пры ўдзеле каля 150 чал. На ёй была заслухана інфармацыя Белкаапсаюзу аб закрытых разьмеркавальніках. Па інфармацыі выказалася 15 асоб.

Я лічу, што закрытыя разьмеркавальнікі лепш будаваць паводле вытворчага прынцыпу. Праўда, такія прадукты, як хлеб і бульба, лепш адпускаць па месцы жыхарства рабочых. Найбольш мэтазгодным — рабіць з закрытых разьмеркавальнікаў нешта накшталт універсальных магазынаў — з рознымі відамі тавараў.

Кантраляваць работу павінен у першую чаргу ўвесь каапэрацыйны актыў прадпрыемства. Пры гэтым работнікаў прылаўку карысна прапускаць, праз агульны сход рабочых. Гэтым мы ўнікнем засьмечаньня каапэрацыйнага апарату чуждымі людзьмі.

З такою думкаю прыблізна згадзілася пераважная большасьць членаў нарады 28 жніўня.

Адразу, пасьля пастаноў спэцыяльнае нарады пры Цэнтрасаюзе, якая зараз адбываецца ў Маскве, будуць даны адпаведныя дырэктывы цэнтральным рабочым каапэратывам аб арганізацыі разьмеркавальнікаў. У першую чаргу закрытыя разьмеркавальнікі будуць створаны пры буйных прадпрыемствах Менску, Віцебску, Гомеля, і Барысава.

Старшыня ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў — тав. Міруц. Па лініі прафсаюзу дрэваапрацоўшчыкаў на нашых прадпрыемствах яшчэ не праведзена растлумачальная работа. У бліжэйшыя два дні, для гэтае мэты будуць скарыстаны абедзеныя перапынкі.

На маю думку, больш мэтазгодна арганізоўваць закрытыя разьмеркавальнікі па вытворчых адзнаках, пры гэтым забясьпечваючы іх самымі розпастонымымі таварамі.

Востра стаіць пытаньне з пашырэньнем сеткі нашых крам, 2-х крам, якія зараз ёсьць, напрыклад, на заводзе «Дрэваапрацоўшчык», бязумоўна, не хапае і ня хопіць. Прыдзецца, мусіць прымацаваць некаторых рабочых, што жывуць у наколіцах гораду, да цэнтральных магазынаў.

Рабочы кантроль ажыцьцявіцца найбольш поўна, калі мы паставім загадчыкам разьмеркавальнікаў рабочага з таго-ж прадпрыемства. Можа прыдзецца, у зьвязку з гэтым, зьняць яго з вытворчасьці. Гэта ня мае значэньня. Трэба заснаваць таксама добраахвотныя брыгады з саміх пайшчыкаў для дапамогі загадчыку.

На жаль, апрача асобных гутарак з рабочымі — гэтае важнейшае мерапрыемства (закрытыя разьмеркавальнікі) дагэтуль слаба папулярызавана.

Адказны сакратар ЦП саюзу будаўнікоў — т. Плоткін. Ва ўмовах будаўнікоў лепш будаваць закрытыя разьмеркавальнікі ў раёнах жыхарства рабочых. Пры сэзоннай, часовай рабоце — ствараць разьмеркавальнікі паводле вытворчага прынцыпу № па-мойму ня варт.

Абавязкова трэба імкнуцца да таго, каб загадчык разьмеркавальніку быў выбарны ад рабочых. У разьмеркавальніку-ж павінны быць і хлеб, і мяса, і адзеньне — усё тое, што патрэбна пайшчыку.

На сёнешні дзень па ўсіх мясцкомах, на пабудовах гэтае пытаньне абгаворана даволі грунтоўна.

На нарадзе пры ЦСПСБ вызначылі для першачарговае арганізацыі разьмеркавальнікаў некалькі прадпрыемстваў, але тэмпы работы яшчэ невыстарчальныя.

Нам. старшыні ЦП саюзу мэталістых — тав. Арэшка. У сувязі з раскідванасьцю рабочых па ўсім горадзе — ствараць закрытыя разьмеркавальнікі паводле вытворчага прынцыпу, на маю думку, нямэтазгодна. Хіба што ёсьць сэнс арганізаваць у разьмеркавальніках па вытворчай адзнацы водпуск прамысловых тавараў. Мяса-ж, хлеб і інш пільна патрэбныя штодня прадукты, ні ў якім разе нельга разьмяркоўваць на прадпрыемстве, бо рабочы будзе ісьці з яго нагружаны, як вярблюд.

Тут паўстане толькі пытаньне адносна рабочага кантролю. На фабрыцы, ці заводзе арганізаваць яго лёгка. Затое горш, калі закрыты разьмеркавальнік —паводле аднакі тэрытарыяльнай. Там неабходна будзе стварыць для гэтае мэты брыгады з прадстаўнікоў розных вытворчасьцяй.

Як відаць, думкі ўсіх намлнёных вышэй таварышоў, выходзяцца на адным:

— Справа стварэньня закрытых разьмеркавальнікаў — важнейшая справа нашага сёньня. Пры іх будзе цалкам замкнаны клясавы прынцып разьмеркаваньня тавараў.

Л—ны.

Замест раёну— у наркаматаўскія габінэты

Рад цэнтральных установаў пераманьвае на работу ў свой апарат тых спэцыялістых, якія павінны паехаць у вёску.

„Толькі-бы нам, а раёнам... хоць нічога"---

так глядзяць некаторыя наркаматы на ўмацаваньне раёнаў

Важнейшая задача партыі — умацаваньне раёнаў кадрамі работнікаў спэцыялістых, у Полацкай акрузе зрываецца на віне некаторых цэнтральных установаў. Полацкая акруга, параўнальна з іншымі, вельмі дрэнна забясьпечана спэцыялістымі, аб гэтым СНК канстатаваў яшчэ 2-га красавіка бягучага году і запрапанаваў Наркаматам ужыць меры да забесьпячэньня акругі спэцыялістымі.

Як-жа Наркаматы выконваюць гэтую дырэктыву СНК БССР?

Яны ня толькі не пасылаюць туды спэцыялістых, а, наадварот, імкнуцца перацягнуць у свае апараты нават тых, якія там ёсьць. У раёнах акругі працуе толькі 40 аграномаў, між тым, як па штату павінна працаваць 70.

Зараз, у сувязі з ліквідацыяй акругі, тыя аграномы, якія працавалі ў акруговых установах, імкнуцца ўхіліцца ад паездкі ў раён. Так, аграном акрза Лаўрык, бяз згоды загадчыка акрза, выхаў у Менск і паступіў там на работу. Аграном Сітнікаў, які быў пакіраваны ў раён, туды не паехаў, а ўладаваўся таксама недзе ў Менску. Агранома Асташэнка, які працаваў пры акрза, з акругі пакіравалі на машына - трактарную станцыю. Але зараз Белсельгасснаб вядзе з ім непасрэдную перапіску і прапануе яму работу ў Віцебску.

У акруговых установах акрза і малжывсаюзе было два вэтэрынарных дактары, аднаго з іх Наркамзем неяк раней узяў па часовую работу, а зараз піша, што пакідае яго працаваць у сваім апараце пазаўсёды. Не абмежаваўшыся гэтым, Наркамзем забірае і другога доктара.

Цікава паказаць яшчэ на такі факт. Вэтдоктар Ляскевіч ахвотна згадзіўся ехаць на работу ў раён, але як толькі атрымаў прапанову Наркамзему паехаць па работу ў Менск, катэгарычна адмаўляецца ад работы на кёсцы. Белкаапсаюз вядзе непасрэдную перапіску з прадстаўнікамі Полацкага аддзяленьня наконт перацягненьня іх па работу ў Менск, абяцае кватэры і ўсё іншае, толькі-б ня пусьціць ехаць у раён.

Такія зьявішчы наглядаюцца і на іншых ведамствах.

Усё гэта зрывае выкананьне важнейшай дырэктывы партыі аб умацаваньні раёнаў кадрамі работнікаў. ЦК-РСІ павінна ўжыць неадкладныя меры і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто ігнаруе партыйныя дырэктывы і імкнецца пераманьваньнем работнікаў сарваць справу ўмацаваньня раёнаў.

МАТУС.

Забыты раён

Чэрэйскі больш, чым які-небудзь другі раён былое Аршанскае акругі патрабуе ўмацаваньня кадрамі работнікаў.

У друку паведамлялася аб тым, што ў гэтым раёне былі грубыя скажэньні партыйнай лініі ў пытаньні кіраўніцтва калгасным рухам, што ў гэтым раёне была праяўлена права - апартуністычная практыка. Аднак, пры разьмеркаваньні работнікаў па раёнах, гэтага ня ўлічыў Аршанскі ліквідком. Пры ліквідацыі акруговых устаноў у Чарэю не далі ніякай маемасьці. Пры разьмеркаваньні работнікаў па лініі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы не далі ніводнага спэцыялістага. Зараз у Чарэі арганізоўваецца райкалгасаюз і каапсаюз. Па штаце ў гэтыя установы патрэбна 7 аграномаў, 2 тэхнікі - будаўнікі, а ў раёне ўсяго толькі 2 аграномы, прычым адзін з іх працуе ў РВК. Тэхнікаў-жа ў раёне няма ніводнага.

Тыя-ж работнікі з акругі, якія прызначаны ў раён, яшчэ ня прыехалі і невядома, дзе знаходзяцца. З 11 чалавек членаў партыі прыехалі ў раён толькі 6 таварышоў, рэшта-ж Козель, Ланін, Грыбаедаў, Нэўдліц, Яскевіч у раён ня прыехалі. Гэтых дэзэртыраў з баявога фронту трэба прыцягнуць да суровай партыйнай адказнасьці.

ТАГАНОВІЧ.

Магілеўская АКК аб справе т. Кліонскай

Прэзыдыум Магілеўскай акруговай кантрольнай камісіі, разглядзеўшы справу члена КП(б)Б т. Кліонскай па абвінавачваньні яе ў нежаданьні паехаць на раён, заслухаўшы яе асабістае тлумачэньне, а таксама разглядзеўшы заяву, якую яна падала ў тарком КП(б)Б,—пастанавіў лічыць абвінавачаньне, высунутае у адносінах тав. Кліонскай, нягрунтоўным.

ФАБРЫКІ МЯСА І МАЛАКА

арганізоўваюць на тэрыторыі БССР трэсты „Скатавод" і малочна-масьляны

25.000 гапоў малочнай жывёлы на Брагінскім масыве

Задача ўсесаюзных трэстаў — «Сьвінавод», «Скатавод», «Аўцавод» і малочна-масьлянага трэсту — у магчыма кароткі тэрмін, — шляхам максімальнага павялічэньня мясных і малочных рэсурсаў, — вырашыць спажывецкую праблему.

Усім гэтым трэстам, для пасьпяховага разьвіцьця сваёй работы, для арганізацыі буйнейшых жывёлаводных і малочных гаспадарак, патрэбны вялікія зямельныя тэрыторыі, патрэбны вольныя зямельныя вучасткі. І таму НКЗ СССР, у тэрміновым парадку, вышуквае ў розных раёнах Саюзу адпаведныя зямельныя тэрыторыі, дзеля чаго накіроўвае на месцы экспедыцыі і камісіі і зьвязваецца з рэспубліканскімі і абласнымі зямельнымі органамі. За апошні час такая камісія саюзнага НКЗ працавала і ў Беларусі, дзе правярала ход работы па выпуленьні вольных зямельных плошчаў.

Саюз

Пазыка „Пяцігодка—за 4 гады“

На буксір--адсталыя сэктары падпіскі!

ХАЛОПЕНІЦКІЯ „ТЭМПЫ“

БЯСПЛЯНАВАЯ, НЕАРГАНІЗАВАНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ

Рэалізацыя пазыкі ў **Халопеніцкім раёне** пачалася толькі ў другой палове жніўня. Кампанія праходзіць самацёкам, ніхто ёю ня кіруе. Раённая камісія садзейнасьці не прыцягнула ў якасьці контрагентаў крэдытныя ўстановы і анчадкасы. Атрымаўшы кантрольныя лічбы, раённая камісія павялічыла іх на 1.000 руб. і разьмеркавала заданьні паміж прафэсыянальнымі саюзамі і амаль што ўсімі савецкімі ўстановамі, наперакор існуючым дырэктывам. Нават аддзяленьне Цэнтрасьпірту атрымала заданьне рэалізаваць пры продажы гарэлкі аблігацый на 500 руб. Добра, што халопеніцкія кіраўнікі своячасова адмовіліся ад гэтага контрагента.

Брыгада пры абсьледваньні работы па пазыцы выявіла, што агітацыйныя матар'ялы, атрыманыя райвыканкомам яшчэ два тыдні назад, дагэтуль не разасланы. У мястэчку вы ня ўбачыце ні аднаго лёзунгу, прысьвечанага рэалізацыі пазыкі.

Раённая камісія садзейнасьці эбіраецца неакуратна. За ўвесь час, паводле слоў старшыні, была заслухана толькі адна справаздача сельскай камісіі садзейнасьці. Яшчэ дагэтуль пры радзе калгасаў няма камісіі садзейнасьці.

Камсод пры местачковым савеце існуе на паперы. Старшыня камсоду ня ведае складу камісіі, колькі было пасяджэньняў. Дагэтуль не ахоплены пазыкай прыместачковыя калгасы і саўгасы. На запытаньне, чаму так павольна праходзіць кампанія рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў, у райкамсодзе адказалі: «З калгасамі няма чаго сьпяшацца, калгасьнікаў заўсёды пасьпеем ахапіць».

Райкрэдыттаварыства, якое павінна быць галоўным контрагентам, нічога ня робіць, за выключэньнем афармленьня тэй падпіскі, якую яму прыносяць.

Насьценгазэта, выпушчаная гэтымі днямі, зусім не закранула пытаньня аб пазыцы.

Актыўная работа адчуваецца толькі сярод настаўніцтва. Самі настаўнікі раёну поўнасьцю падпісаліся на месячны заработак.

Раённая камісія садзейнасьці ня мае дакладных вестак аб ходзе рэалізацыі. Паводле прыблізных вестак, на 27 жніўня па раёне рэалізавана 62 проц. кантрольнага заданьня—сярод рабочых і служачых 101,5 проц., сярод сялян 40 проц., сярод неарганізаванага насельніцтва—28 проц.

Афармлена падпіскі толькі на 635 руб. Прадана сялянам аблігацый за наяўны разьлік на 600 руб. Вельмі дрэнна ідзе падпіска па калгасах. Калгасьнікі раёну падпісаліся толькі на 350 руб.

Дрэнна ў раёне з грамадзкім кантролем. Нізавыя камісіі не ўявілі сабе значэньня кантролю. Дазволы давалі на прыватных пісульках. Даваліся выпіскі з пратаколаў пасяджэньняў, а пратаколаў гэтых нідзе няма.

Наогул, у кампаніі рэалізацыі пазыкі не адчуваецца ніякай плянавасьці.

Брыгадзір «Зьвязды» **Бірштэйн.**

Выплата выйгрышаў на вёсцы

У часе праверкі рэалізацыі пазыкі па Халопеніцкім раёне, брыгада рэдакцыі «Зьвязда» і Наркамфіну праверыла аблігацыі 3-й пазыкі і знайшла неаплачаныя выйгрышы. Адзін з выйгрышаў у суме 200 руб. прыпаў на аблігацыю, набытую калектыўна сялянамі пасёлку Май у ліку 18-ці двароў.

Выйгрыш прыпаў па тыражу мінулага году; доўга-доўга зьбіралася раённая камісія садзейнасьці і ашчадная каса выехаць у пасёлак і выплаціць сялянам грошы. Але сяляне не дачакаліся прыезду прадстаўнікоў раёну.

Толькі зараз, па ініцыятыве брыгады, быў арганізаваны ўрачысты сход жыхароў пасёлку, прысьвечаны аплаце выйгрышу. Гэты-ж сход быў скарыстаны для дакладу аб пазыцы «пяцігодка — за чатыры гады». Тут-жа на сходзе сяляне падпісаліся на 100 руб. і адразу ўнесьлі грошы.

Пасьля перадачы выйгрышу, пасёлкаўцы сабраліся параіцца, што рабіць з выйгранымі грашыма. Пасьля доўгага абмеркаваньня, пастанавілі набыць сельска - гаспадарчыя машыны.

На сходзе была наладжана праверка аблігацый. Выявілася, што аблігацыя Краснапуцкага лясьніка Сухая выйграла 20 руб. Яму тут-жа быў выплачан выйгрыш.

Наогул, выплата выйгрышаў на месцы вельмі дапамагае папулярызацыі дзяржаўных пазык.

Б—н.

НАВЯРСТАЦЬ УПУШЧАНАЕ

На 1 верасьня падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» па ўстановах і прадпрыемствах, прымацаваных да Менскай гарадзкой касы ашчадняасьці, дасягнула 750 тыс. рублёў. Дрэнна афармляецца падпіска, ёсьць выпадкі, калі адміністрацыя затрымлівае грошы, сабраныя з падпісчыкаў.

Дрэнна ідзе падпіска па будаўнічых арганізацыях. Весткі аб ходзе падпіскі прыслала толькі Менскае аддзяленьне Белбудаб'яднаньня; Менбуд і Белжылсаюз да сёньняшняга дня не даюць вестак.

Зусім кепска працуюць жакты. У той час, калі сярод хатніх гаспадынь і неарганізаванага насельніцтва трэба было рэалізаваць 117 тыс. руб., на сёньняшні дзень сабрана толькі 3 тысячы. Жакты гэтай справай ня цікавяцца. Калі ў старшыні жакту № 15 спыталіся, як ідзе падпіска, ён адказаў: «Я не займаюся такімі дробязямі, зьвярнецеся да тэхсакратара».

Старшыня камісіі садзейнасьці Белкаапсаюзу Каржуеў на запытаньне, чаму ён не прысылае вестак аб ходзе падпіскі, заявіў: «Нічога, пасьпеем даць весткі да 15 верасьня».

Прафсаюзы прымаюць слабы ўдзел у рэалізацыі пазыкі.

Усе тэрміны ўжо мінулі, між тым 100-процантны ахоп працоўных гор. Менску яшчэ не забясьпечаны. Трэба ўдарнымі тэмпамі навярстаць упушчанае.

Ц.

ТОЛЬКІ НА 74 ПРОЦ.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Паводле даных на 1 верасьня, заданьне па рэалізацыі пазыкі ў Бабруйскім выканана на 74 проц. Сума падпіскі дасягнула 1.382 тыс. рублёў.

На першым месцы ідзе **Асіповіцкі раён, які даў 102 проц.** кантрольных лічбаў. Бабруйск выканаў сваё заданьне на 84 проц. Цягнуцца ў хвасьце Бабруйскі і Глускі раёны, якія рэалізавалі па 47 проц.

Слаба рэалізуецца пазыка на вёсцы. Плян рэалізацыі выкананы на 1-га верасьня на 30 проц., Клічаўскі раён выканаў заданьне па сялянскай падпісцы на 10 проц., Бабруйскі на 13 проц.

МЕНСК

ПЛЯН

СЬВЯТКАВАНЬНЯ XVI МЮД'у ПА ГОР. МЕНСКУ

Напярэдадні 16 МЮД'у, ва ўсіх прадпрыемствах і калектывах праводзяцца лятучыя мітынгі і гутаркі аб МЮД'е.

4 і 5 верасьня ячэйкі ЛКСМБ праводзяць па клюбах інтэрнацыянальныя і вытворчыя вечары з пастаноўкай дакладу аб МЮД'е.

6-га верасьня, а 11 гадзіне раніцы, БДТ-2 дае паказ «Авангард» для камсамольскай арганізацыі і працоўнай моладзі, якая працуе на вячэрніх зьменах і выхадзінкоў у гэты дзень.

6 верасьня, а 6 гадзіне ўвечары, агульнагарадзкая дэманстрацыя камсамольцаў і рабочай моладзі (гл. загад № 1).

6 верасьня, а 10 гадзіне ўвечары, у садзе «Прафінтэрн» (Трэк) масавая інсцэніроўка, прысьвечаная 16 МЮД'у пры ўдзеле і пад кіраўніцтвам усяго калектыву БДТ-2.

7-га, а 6 гадзіне ўвечары, вялікае фізкультурнае сьвята на ўсебеларускім стадыёне імя 10-цігодзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Цэнтральны штаб па правядзеньні XVI МЮД'у.

Беларускі вінаград—на выстаўцы

У павільёне садоўніцтва Ўсебеларускай выстаўкі зьмешчаны цікавы экспанат—гатункі вінаграду, вырашчаныя ў гор. Рагачове. Экспанаты вінаграду прысланы настаўнікам - краязнаўцай РУТКОЎСКІМ, які ўжо 5 год вядзе досьледы культуры вінаграду. Гэтыя досьледы паказваюць, што на Беларусі магчыма ня толькі аранжэйная культура вінаграду, але і культура ў звычайных умовах.

Спыніць „ліквідацыйныя“ адносіны да выстаўкі

Ня трэба гаварыць аб тым, якое важнае палітычна-гаспадарчае значэньне мае Ўсебеларуская выстаўка. Але некаторыя арганізацыі ня ўлічваюць значэньня выстаўкі і зусім нядбайна адносяцца да папаўненьня яе экспанатамі.

Назіраюцца некаторыя «ліквідатарскія настрої»—быццам, выстаўка ўжо сваю ролю адыграла і больш цікавіцца ёю ня трэба.

Паводле пляну, у павільёне зямляробства павінен быць плякат структуры навукова-дасьледчага інстытуту і сеткі дасьледчых устаноў. Плякат быў прысланы на выстаўку, але камісія яго ня прыняла і запрапанавала перарабіць. НДІ павінен быў прысласць новы плякат, але і на сёньняшні дзень яго няма. Выстаўка не адлюстроўвае росту навукова-дасьледчых устаноў па сельскай гаспадарцы.

Цэнтральная бульбяная станцыя даставіла экспанат, які паказвае вырошчваньне новых гатункаў бульбы пры дапамозе скрыжаваньня і размнажэньня насеньнем. Расьліны ўжо пажоўклі і пагнілі. Выстаўленыя стандартныя гатункі бульбы на сёньня страцілі свой колер і пазелянелі на паветры. Экспанат павінен зьмяняцца кожны тыдзень. Бульбяная станцыя яшчэ ні разу гэтага не зрабіла. Матар'ялу для замены няма, і экспанаты прышлося прыняць, засталіся толькі парожнія вітрыны.

Цэнтральная агра-хэмічная лябараторыя павінна была даць у адзел аграхэміі тлумача. Тлумач працаваў толькі да 19 жніўня, потым зьнік, і ўжо 10 дзён аддзел ня мае тлумача.

Т.

Выдача цукру ў верасьні

МЦРК распачаў выдачу цукру за верасень пайшчыкам 1-ай катэгорыі. У сувязі з гэтым, па горадзе пашырыліся чуткі аб тым, што цукар будзе выдавацца выключна рабочым, а служачым і іншым групы насельніцтва не атрымаюць цукру.

У Наркамгандлі нашаму супрацоўніку заявілі, што гэтыя чуткі ня маюць пад сабою ніякай падставы. Часова затрымалася дастаўка цукру ў Менск, і ЦРК, каб не раздрабляць выдачу на некалькі раз, пастанавіў выдаць з запасаў цукру ў першую чаргу рабочым па поўнай норме.

У верасьні служачыя поўнасьцю атрымаюць належачую ім норму цукру.

Парттройка ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 10 верасьня а 18 з пал. гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т.: Атапава М. П., Скарахода Д. Л., Гуровіча І., Казакова Я. М., Барановскага Я. П., Крывановава П. Я., Сьмірнова П. З., Несьцера С. А., Татаржыцкага П. А., Загіроўскага А. П., Кудзінава М. А., Сакалова Х. З., Глікіна М. Г. Памянёныя т. т. запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх спраў.

ЗА ДЗЕНЬ

— Саюз сельгаслесрабочых пастанавіў склікаць 15 кастрычніка Ўсебеларускі зьлёт рабочых саўгасаў і батракоў-ударнікаў. У апошніх лічбах верасьня склікаюцца раённыя зьлёты ўдарнікаў.

— Учора пачаліся заняткі ў менскіх сямігодках. Паводле прыблізных падлікаў, на заняткі зьявілася 17 тысяч вучняў.

— Гэтымі днямі на менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік» адкрылася рамонтная майстэрня.

— 710 піянэраў і вучняў выехалі ў прыгарадныя калгасы для работы па ачыстцы агародніны ад шкоднікаў.

— У Менску адбываюцца зараз масавыя прафсаюзныя шахматна-шашачныя спаборніцтвы, прысьвечаныя V канграсу Прафінтэрну. У спаборніцтвах прымаюць удзел да 400 рабочых.

— З 10-га верасьня ў Менску пачынаюцца спэктаклі беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатру пад кіраўніцтвам Галубка. Тэатр папоўнены новымі сіламі. Сваімі пастаноўкамі тэатр абслужыць дом Селяніна і Ўсебеларускую выстаўку. Рыхтуецца да пастаноўкі новая п'еса «Эпоха»,—Сташэўскага, з часу грамадзянскай вайны.

— У Сьмілавіцкім, Халопеніцкім, Чэрвеньскім і Койданоўскім раёнах скончылі работу курсы чырвонага крыжу для **калгасьніц і саўгасьніц** па аказаньні першай мэдычнай дапамогі ў часе ўборачнай кампаніі.

— Менскі гарадзкі камітэт Чырвонага Крыжу адчыняе новую **лячэбніцу-стацыянар.**

— З Менску ў Кіеў выяжджае дэлегацыя Чырвонага крыжу для падпісаньня сан. дагавору.

Скончыўся прыём на пэдфак

Скончыўся прыём на факультэт народнае гаспадаркі і пэдфак БДУ. На факультэт наргасу прынята 187 чалавек, на пэдфак прынята 286 чалавек, з іх—98 рабочых, 105 калгасьнікаў - беднякоў і сераднякоў і 83 служачых.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ, 5 ВЕРАСЬНЯ

— **Дом Пісьменьніка.** А 5 гадз. дня адбудзецца агульны сход Менскае філіі БелАПП. Павінны абавязкова зьявіцца ўсе члены БелАПП і члены цэнтральнага рабочага літаратурнага гуртку. У парадку дня вельмі важныя пытаньні.

— **Пэдгабінэт.** А 19 гадз.—сход кладчыкаў сьпеваў. Яўка абавязкова.

— **Фрунз. РК МОПР'у.** У памяшканьні ЦК МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца папыранае пасяджэньне Фруна. РК МОПР'у. Яўка членаў райкому абавязкова. Запрашаецца актыў.

— **ЦП саюзу Белпрацасьветы** выклікае наступных асьветнікаў г. Менску зьявіцца ў ЦП саюзу (Дом Працы, 3-ці паверх, пакой № 13) сёньня а 7 гадз. веч. на нараду па пытаньні правядзеньня перавыбарчай кампаніі па саюзе працасьветы: т. т. Касьцян (5 шк.), Карзон (5 шк.), Рубін (23 шк.), Левінсон (БДУ), Рак (БАН), Фодзіман (8 шк.), Дварэцкі (Дом Асьветы), Чаркоўская (ГК № 5), Зенько (22 шк.), Усьпенская (4 шк.), Маршак (32 шк.), Генкіна (7 шк.), Мірэнбург (Бел. Дз. Б-ка), Эстэркіна (23 шк.), Таршыс (30 шк.), Дайнэка (33 шк.), Ліберман (кл. Леніна), Лотвіна (ін-т пэдагог. і пэдалёт.), Анісімаў (шк. будаўн.), Гальчук (1 шк.), Нікіцкі (ГК № 3), Варанецка (3 шк.), Рулько (ГК № 9), Курыловіч (5 шк.), Навапруцкая (ГК № 7), Фішар (17 шк.), Шапіра З. (10 шк.), Цімянкова (20 шк.) і Магілянскі (30 шк.). Яўка ўсіх памянёных т. т., а таксама добраахвотнікаў усіх сэктараў ЦП саюзу абавязкова.

ЗАЎТРА, 6 ВЕРАСЬНЯ

А 10 гадз. раніцы ў памяшк. Кампуву (Ленінская аўд.) адбудзецца нарада ўсіх выкладчыкаў КУБ. Яўка ўсіх выкладчыкаў абавязкова.

Дом Асьветы закупіў на 9 верасьня 1930 г. для членаў саюзу працасьветы спэктакль балету дзяржаўнай маскоўскай студыі імя Айседоры Дункан у садзе «Прафінтэрн». Білеты штодзенна ў канцылярыі Дому з 11 да 2 і з 6 да 10 гадз.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Наблізіць рачны транспарт да раёнаў

Арганізуецца беларускае дзяржаўнае рачное параходзтва

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, начальнік рачнога плянава-эканамічнага кіраўніцтва Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін тав. **Натонзк** паведаміў наступнае:

— Аднэй з прычын адставаньня рачнога транспарту ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва зьяўлялася дагэтуль надзвычайна складаная форма яго кіраваньня. Народны Камісарыят Шляхоў Зносін пастанавіў рэарганізаваць і ў корані перабудаваць існуючыя формы кіраўніцтва рачным транспартам.

Дзяржаўныя параходзтвы раздрабляюцца, паводле прынцыпа дэцэнтралізацыі і гаспадарчага разрахунку.

Між іншым, з Дняпроўскага і Паўночна - Заходняга кіраўніцтваў дзяржаўнага рачнога флёту вызначаюцца водныя шляхі, што знаходзяцца ў межах Беларусі: Заходняя Дзьвіна, Верхні Дняпро, Бярэзіна з яе сыстэмаю і г. д. Арганізуецца Беларускае дзяржаўнае рачное параходзтва з кіраўніцтвам у гор. Менску. Гэтае кіраўніцтва будзе самастойным гаспадарчым прадпрыемствам, непасрэдна падпарадкаваным Маскве.

Гэтым НКШЗ імкнецца дасягнуць наступных мэт: максымальна наблізіць рачны транспарт да раёнаў, лепш скарыстаць і задаволіць мясцовыя запатрабаваньні, уключыць у рачны тавараварот новыя раёны, значна пашырыць сетку эксплёатацыі водных шляхоў і, у прыватнасьці, паленшыць абслугоўваньне прамысловага і калгаснага будаўніцтва.

Канчатковае вырашэньне гэтага пытаньня вынясе калегія Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін у лістападзе бягучага году. Да гэтага тэрміну трэба распрацаваць усебаковы эканамічны плян правядзеньня новай рэформы.

Бязумоўна, рэарганізацыя зьвязана з вялікімі труднасьцямі, а прычыны недахопу флёту, кадраў і інш. Нялёгка будзе таксама, як належыць, абгрунтаваць межы і раёны новага параходзтва.

Усе гэтыя труднасьці будуць з посьпехам разьвязаны толькі тады, калі па пытаньні рэарганізацыі будзе зьвернута ўвага грамадзкасьці БССР. Вельмі важна, каб у гэтай справе прымалі ўдзел шырокія масы работнікаў воднага транспарту.

Юр.

Ад калегіі АДПУ

МАСКВА, 2. АДПУ арыштаваны: Кандрацьеў Мікола Зьмітрукоў, Громан Уладзімер Густававіч, Садырын Паўлюк Аляксандраў, Чаянаў Аляксандар Васільеў. Юроўскі Леонці Наўмавіч, Суханаў (Гімэр) Мікола Мікалаў, Макараў Мікола Паўлавіч, Рамзін Леанід Канстанцінавіч, Базараў Уладзімер Аляксандравіч і інш., як удзельнікі і кіраўнікі контр - рэвалюцыйных арганізацый, што паставілі сабе мэтай зьвяржэньне савецкай улады і адпаўленьне ўлады памешчыкаў і капіталістых.

Арыштаваныя прызналі сваю кіруючую ролю ў гэтых контр-рэвалюцыйных арганізацыях і сваю сувязь са шкодніцкімі арганізацыямі спэцыялістых, у тым ліку шахцінцамі. Сьледзтва працягваецца.

Перад навучальным годам у ВНУ

Прыём у пэдустановы

— Калегія Наркамасьветы на апошнім пасяджэньні адзначыла нездавальняючы ход камплектаваньня пэдагагічных тэхнікумаў і ВНУ рабочымі, мізэрны процант заяў ад членаў партыі і камсамольцаў. Ня выканана пастанова аб мабілізацыі 1.500 камсамольцаў у пэдагагічныя ВНУ і тэхнікумы. Зусім не пасланы на вучобу рабочыя, якія скончылі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла прасіць ЦК КП(б)Б мабілізаваць 45 камуністак - работніц у пэд. ВНУ і тэхнікумы, ЦК ЛКСМБ на працягу дэкады правесьці мабілізацыю камсамольцаў. Пры пэдагагічных ВНУ і тэхнікумах трэба арганізаваць курсы для падрыхтоўкі рабочых.

СЕНЬНЯ, 5-га верасьня а 8 гадз. веч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, адбудзецца

ПРАЦЯГ СХОДУ РАБОЧЫХ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ СУМЕСНА З ПРАЦАЎНІКАМІ МЦРК

па пытаньні аб становішчы і далейшых перспэктывах забесьпячэньня працоўнага насельніцтва гародніной і аб узяцьці рабочымі абутковай фабрыкі МЦРК на грамадзкі буксір.

Акрамя рабочых абутковай фабрыкі і працаўнікоў МЦРК на сход запрашаюцца рабочыя спажыўцы, прадстаўнікі НК РСІ, НКГ, НКЮ, БКС, брыгада УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу, гандлёвай секцыі Гарсавету, рэдакцыі газэт і ўвесь праф. і кааператыў.

ЦСПСБ, гарадзкія камітэты КП(б)Б і Менская гарадзкая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе

скліканць СЕНЬНЯ

5-га верасьня а 7 гадз. веч. у клюбе Менгарсавету (пляц Волі, 4, 3-ці паверх)

ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ

членаў камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе, членаў ФЗМК і загадчыкаў агітмасавых сэктараў ячэек КП(б)Б.

У парадку дня: даклад аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва і аб ходзе рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за 4 гады». Дакл. нам. Наркамфіну БССР т. Бунін.

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

ЦСПСБ, Гар. камітэты КП(б)Б і гаркамсод.

ЦП саюзу мэдсанпрацы, вэтсэкцыя і групком № 1 паведамляюць аб несваячасовай трагічнай сьмерці члена вэтсэкцыі, старэйшага доктара

УМІЛЬЯНОЎСКАГА І. В.

Пахаваньне адбудзецца 5-га верасьня а 5 гадз. веч. з анатамічнага корпусу Унівэрсытэцкага Гарадка.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

„АВАНГАРД“ 5, 6 7, 8 верасьня п'еса ў 4-х дзеях. **В. Катаеў.**

Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Сакалова. Дырыжэр І. Гіттарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ вядзе С. Калпашнікаў.

Пачатак роўна а 8 з пал. гадз. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

Мастацкі ЦЫРК Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

У пятніцу, 5 верасьня

ВЯЛІКАЕ ПАКАЗАЛЬНАЕ ЗРЭЛІШЧА

ў 3-х адз. 15 №№

Першая гастроль папулярных сатырыкаў

БІБ І БОБ.

НОВЫ ЗЛАБАДНЕЎНЫ ЖАНР,

а таксама прымае ўдзел поўны ансамбль трупы.

— Пачатак а 8 з пал. гадз. веч. —

Ездуць два вагоны муштраваных коняў пад кіраўніцтвам **д. І. ЗІНДОРФА.**

НЯДЗЕЛЯ, 7 верасьня **грандыёзны РАНІШНІК.** Цэны ад 40 кап.

Адказны кіраўнік СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр **„Культура“** — ТОЛЬКІ 4 ДНІ. Ад чацьвярга, 4 верасьня. ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ ПРА ЗАХАД **ДА ШЧАСЬЛІВАЙ ГАВАНІ.** Зьніш праграмы: ГАСТРОЛІ выдатнай артысткай **Эльгі АРЭНС.** Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г., 40 м., 10 г. 20 м. Каса адчынена ад 5 г.

КІНО **інтэрнацыянал** — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ПАВАРОТ.** Драма ў 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО **„Пралетары“** — 2-гі — тыдзень — 2-гі. Нямецкі мастацкі фільм **Начны крык.** Драма ў 7 частках. Пач. 1 сэансу а 7 г. Каса адчын. ад 5 г.

Дзіцячы кіно - тэатр **„Юны піянэр“** — НОВАЯ КАРЦІНА **Сапраўдныя паляўнічыя.** Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз. дня, 2-га—а 3 гадз. 30 м. Каса адкрыта з 12 гадз. дня.

КІНО-САД — ВЭРНЭР КРАУС, ЖЭНІ ЮГО у карціне **Жонка статс-сакратара.** Тольні 2 сэансы: пачатак 1-га сэансу а 9 гадз., 2-га сэансу а 10 г. 30 м.

Кіно **„СПАРТАК“** — З панядзёлка, 1 верасьня. НЯМЕЦКІ БАЯВІК **ВАР'ЕТЭ.** драма 7 частках. У гал. ролях: ЭМІЛЬ ЯНІНГС і ЛІА дэ-Пуці. Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г., 11 г. КАСА—ад 6 гадз.

АНОНС

ГЭТЫМІ ДНЯМІ

Мастацкі гістарычны фільм вытворчасьці Саюзкіно 1930 г.

Пабег 10 сьмертнікаў з Варшаўскай турмы

ЗАЎТРА ЎНАЧЫ (Завтра ночью)

Рэж. Краўцуноўскі. Апер. Юдзін.

У гал. ролі Народн. артыстка О. КІПП Р-ЧЭХАВА.

Сачэце за рэклямай!

ШКОЛА МАЛОДШАГА ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ ст. КАЛІНКАВІЧЫ

На базе сямігодкі з 2-гадовым тэрмінам навучаньня прымае да 15 верасьня ў наступныя аддзяленьні:

1) Эксплёатацыйнае —80 ч. 1 курс
2) Цягавае —80 ч. 1 курс
3) Пупейскае —40 ч. 1 курс
4) Электра-мэханічнае-сувязі—18 на II курс. з 9 гр. адпаведнага ўхілу.

Правілы прыёму і ўмовы жыцьцёвага забесьпячэньня тыя-ж, што і ў тэхнікумах. Заявы з усімі дакумэнтамі накіроўваць на адрасе: ст. Калінкавічы, Зах. чыг., школа малодшага тэхнічнага пэрсаналу.

Нач. школы Ласевіч.

ОБ'ЯВЛЕНИЕ.

Настоящим доводится до сведения всех ведомств учреждений, предприятий и огранизаций, ИМЕЮЩИХ ПОТРЕБНОСТЬ В ПЕРЕВОЗКАХ ГРУЗОВ, что на основании директив правительства СССР и приказа Народного Комиссара Путей Сообщения от 12 августа с. г. за № 1715

ЗАПАДНЫЙ РАЙОННЫЙ КОМИТЕТ ПО ПЕРЕВОЗКАМ с 1-го сентября 1930 г. РЕОРГАНИЗОВАН В ЗАПАДНОЕ ЭКСПЛОАТАЦИОННО-ПЛАНОВОЕ УПРАВЛЕНИЕ НКПС'а (ЭПУ)

с местонахождением в г. СМОЛЕНСКЕ (Б. Пролетарская, д. № 11)

Район действия Западного Эксплоатационно-Планового Управления остается в прежних границах бывшего Районного Комитета, т. е. охватом целиком границ МББалтийской и Западной жел.дорог и построечных линий: Москелдорстроя, Черновжелдорстроя и Росмосдорстроя, шоссейно-грунтовых и водных путей верхнего Днепра и Западной Двины с притоками и с обслуживанием целиком нужд в перевозках БССР. Западной области и части территории УССР, Московской, Ленинградской и Центрально-Черноземной областей, по коим проходят вышеуказанные железно-дорожные, водные и шоссейно-грунтовые пути.

В круг ведения Эксплоатационно-Планового Управления входят функции, предусмотренные Положением об этих Управлениях и в основном сводятся к планированию перевозок и техническому руководству Эксплоатационной и грузовой работы железнодорожного, речного и шоссейно-автомобильного транспорта.

В связи с означенной реорганизацией, в отмену существовавшего порядка представления хозорганами заявок на перевозки грузов в плановом порядке в бывший Районный Комитет по перевозкам, ныне плановые заявки, начиная с перевозок на Октябрь месяц должны представляться соответственно во вновь образуемые с сентября м-ца сего года при Экономсоветах Союзных Республик и областных Исполнительных Комитетах—Местные Советания по перевозкам (МСП), в соответствии с постановлением СТО от 11 августа с. г., об'явленного в газете «Известия ЦИК'а» от 29-VIII с. г. за №—238, и одновременно копии этих заявок представляются Эксплоатационно-Плановому Управлению.

АДРЕС: Гор. Смоленск, Б. Пролетарская, д. № 11.

ТЕЛЕФОНЫ: Через город: Коммутатор Управления № 1-20
» » Кабинет » № —
» Коммут. вокзала: Общий » № —8-54
» » Кабинет » № —69
» » » № —18

Начальник Западного Эксплоатационно-Планового Управления НКПС'а САМОСЮК.

Эльвод даводзіць да ведама абанэнтаў ВАДАПРАВОДУ, што ў сувязі з далучэньнем да вадаправоду магістралі па вул. Урыцкага будзе спынена падача вады **ПА САВЕЦК. ВУЛ,** (ад Ленінскай да Валадарскага вул.) з 12 гадз. ўночы 5-га верасьня да 6 гадз. раніцы 6-га верасьня г. г.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ у Віцебскі індустрыяльна-пэдагагічны інстытут на:

а) фізыка-тэхн. аддзяленьне,
б) хэміка-тэхналёгічнае аддзяленьне,
в) яўрэйскую сэкцыю гэтых-жа аддзялён.

працягнуты да 20 верасьня г. г. іспыты і запічэньне з 25 верасьня па 1 кастрычніка.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗБЕЖПАДАЧАМІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,

АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч.

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурна-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрытыя 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папяраднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту. Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

МАГІЛЕЎСКІ **БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ**

даводзіць да ведама, што

ПРЫЁМ ЗАЯЎ аб паступленьні на першы курс на 1930-31 навуч. год праводзіцца **да 15 верасьня г. г.**

Тэрмін залічэньня ўстанаўляецца з 15 па 20 верасьня г. г. Пачатак заняткаў у кастрычніку месяцы.

Паступаючыя ў тэхнікум павінны мець агульную адукацыю ня ніжэй 7-годкі; скончыўшыя курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум ад іспытаў вызваляюцца.

Паступаючыя ў тэхнікум падаюць заяву на імя прыймовай камісіі і далучаюць наступныя дакумэнты: а) дакумэнт аб узросце (мэтрыка), б) аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын), в) дакумэнт аб асьвеце, г) дзьве фатаграфічныя карткі, д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага, е) даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў пасьля рэвалюцыі, ж) даведка засьведчаная мясцовай савецкай арганізацыяй аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў, з) для сялян—акладны ліст або засьведчаная копія з яго па с.-г. падатку на 1929-30 г., і) анкета, заверная прафэсыянальным або савецкімі арганізацыямі.

Увага. Ніякія копіі дакумэнтаў ня прымаюцца (за выключэньнем дакумэнтаў аб адносінах да вайсковай павіннасьці).

Да заявы трэба дадаць паштовыя маркі на 20 кап. для адказу палаўці заявы.

Часовы адрас тэхнікуму: Магілеў, вул. Міронава, № 17, тэл. 2-86

Дырэктар Маг. буд. тэхнікуму ЛІПСКІ.

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР абвяшчае, што б. у ведальні НКАсьветы БССР Магілеўская школа дзесятнікаў і дар. майстроў **РЭАРГАНІЗАВАНА Ў ДАРОЖНА-БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ.**

Прыём на агульных падставах, згодна даведніку НКАсьветы БССР. Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам. Заявы прымаюцца да 10 верасьня ў канцылярыі тэхнікуму ў г. МАГІЛЕВЕ, ЛЕНІНСКАЯ, № 43.

Галоўдартранс БССР.

Тэрмінова патрабуецца ПАКОЙ або КВАТЭРА Плата па ўмове з прапановамі зварочвацца па адрасе: Унівэрсытэцкі Гарадок, Мэдычны інстытут, катэдра Паталёгічнай Фізыялёгіі, прафэсар Колпікоў, або (ад 10 да 3 гадзіны) д-р Гарызонтаў.

ПРЫБЛУДЗІЛАСЯ аўчарка (сука). Пасьля 3-х дзён лічу сваёй. Пляц Волі, д. № 43-1, кв. 4.

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

лічыць несапраўднымі:

Вуч.-конск. карт. Паўловіча У. 834
Вайск. біл. Дубко П. Е., выд. Барыс. ваенкаматам. 835
Чл. біл. саюзу працасьветы № 3109 Дарошак В. Д.